№№123–124
(3460–3461)

16 жніўня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СКАНДАЛ

Почему «невъездного» Рыбакова не пустили в Литву

На прошлой неделе случился скандал. Судью Верховного суда Беларуси Алексея Рыбакова и заместителя министра юстиции Аллу Бодак не впустили в Литву.

В Европу они не смогли попасть по причине того, что находятся в списке белорусских чиновников, которым после президентских выборов 2010 года запрещен въезд в страны ЕС и США. Однако в эфире БТ Алексей Рыбаков и Алла Бодак недоумевали, что случился такой инцидент. Телезрителям объяснялось, что юристы направлялись в Литву не по частным делам, а по приглашению ООН для участия в конференции по проблемам наркотрафика и альтернативных видов наказания для наркозависимых.

А.Бодак действия литовской стороны назвала противоречивыми: мол, данное мероприятие носит гуманитарный характер, проводится в рамках Организации Объединенных Наций, следовательно, в данной ситуации запрет на въезд в страны ЕС как бы не действует. А Рыбаков жаловался на то, что ввиду такой позиции Литвы белорусские юристы были лишены возможности перенять европейский опыт, который *"готовы были использовать в своей работе при совершенствовании законодательства"*.

"В последний момент было получено сообщение, что мне отказано в выезде по причинам неизвестным", — рассказывал в эфире БТ Алексей Рыбаков.

Любопытно, что неизвестными он называл причины, которые, казалось бы, кому-кому, но Рыбакову известны давно. Ведь в список невъездных он попал еще в 2006 году. И европейцы не скрывали, почему прибегли к такой мере: в июле 2006 года Алексей Рыбаков председательствовал в Московском суде Минска на процессе по делу экс-кандидата в президенты Александра Козулина, которого после президентских выборов 2006 года обвинили в хулиганстве и нарушении общественного порядка.

Этот судебный процесс имел широкий резонанс. Многочисленные наблюдатели отмечали, что в ходе судебных слушаний сторона обвинения не представила существенных фактов, которые бы свидетельствовали о том, что во время президентской кампании кандидат на этот пост профессор Александр Козулин нарушал белорусские законы. Тем не менее судья Рыбаков приговорил Александра Козулина к 5,5 года заключения с отбыванием срока в колонии общего режима. *"Я не могу назвать это судом, это — судилище. Притом это настолько ангажированная и настолько запланированная акция, что в этом уже не осталось никаких сомнений"*, — заявил тогда Козулин.

Вины своей он не признал и в тюрьме все документы подписывал не иначе, как *"незаконно осужденный Александр Козулин"*. Международная общественность признала Александра Козулина политическим заключенным, ЕС и США требовали от белорусских властей его немедленного освобождения. На свободу экс-кандидат в президенты вышел в августе 2008 года. Ему было сказано, что Александр Лукашенко подписал указ о помиловании...

После того громкого процесса судья Алексей Рыбаков быстро стал продвигаться по карьерной лестнице. Весной 2007 года он был назначен судьей Минского городского суда, а в декабре 2007-го — судьей Верховного суда Беларуси. Однако с 2006 года Рыбакову запрещен въезд в страны ЕС и США.

Так чего обижаться? Не лучше ли попросить прощения у того же Александра Козулина.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Белорусский ответ полякам

В Беларусь не пустили двух польских политиков — председателя объединения *Wspolnota Polska* **Лонгина Комоловского и европарламентария, члена партии "Польша важнее всего" (PJN) Марека Мигальского. Белорусские пограничники отказали им во въезде на территорию страны, сообщает** БелаПАН **со ссылкой на польский информационный** портал TVN24.

Лонгин Комоловски 14 августа направлялся в Гродно на торжества по случаю праздника Войска Польского, организованные не признанным белорусскими властями Союзом поляков в Беларуси. На погранпереходе в Кузнице он узнал, что находится в списке иностранных граждан, которым запрещен въезд в Беларусь. За разъяснениями политику посоветовали обращаться в белорусское посольство в Польше.

Возглавляемая им неправительственная организация *Wspolnota Polska* действует под патронажем сената Польши, занимается укреплением связей с польскими диаспорами за границей и оказывает помощь полякам по всему миру.

Марека Мигальского белорусские пограничники сняли с поезда на погранпереходе "Тересполь"—"Брест" в ночь с 14 на 15 августа. *"Меня вывели из поезда и проводили к месту пограничного контроля. Там мне возвратили билет и сообщили после долгого ожидания, что не впускают в Беларусь"*, — цитирует евродепутата *TVN24*.

Мигальски ехал в Беларусь по приглашению закрытого белорусскими властями правозащитного центра "Весна", намереваясь обсудить ситуацию с передачей польской Генпрокуратурой белорусским фискальным органам информации о банковских счетах руководителя центра **Алеся Беляцкого.**

Это уже не первый случай отказа во въезде в Беларусь европейским политикам. Фактически такие меры являются ответными на "черный список" белорусских госслужащих, утвержденный руководством Евросоюза. О списке невъездных в Беларусь европейских чиновников и политиков впервые стало известно в марте 2011 года, однако сам список никогда нигде не публиковался, и фамилии нежелательных для въезда в Беларусь европейцев становятся известны в основном лишь после их попыток получить белорусскую визу или пересечь белорусскую границу.

А вот "черный список", утвержденный Евросоюзом, не является секретным. Кстати, в соответствии с ним 11 августа отказано во въезде в Польшу председателю Союза писателей Беларуси **Николаю Чергинцу** и депутату Палаты представителей **Михаилу Орде**, которые направлялись на похороны основателя и руководителя польской партии "Самооборона" Анджея Леппера.

Антон ТАРАС.

АНОНС

Алесь Бяляцкі: хто ён?

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі са скуры вылузваюцца, каб паказаць старшыню пазбаўленага ліцэнзіі праваабарончага цэнтра "Вясна" Алеся Бяляцкага толькі з аднаго боку — як парушальніка падатковага заканадаўства. Ні слова пра тое, чаму ён вымушаны быў адкрываць рахункі ў замежных банках, ні паўслова, як выкарыстоўваліся грашовыя сродкі... Яшчэ вядзецца разбіральніцтва, не вядома, будзе суд ці не будзе, а паводле сцвярджэнняў праўладных прапагандыстаў, ён — злачынца. Што гэта, падыграванне "Чырвонаму дому"? Следству? Іншым сілам, для якіх актыўная дзейнасць праваабаронцаў — костка ў горле?

"Народная Воля" лічыць некарэктным умяшальніцтва на даным этапе ў юрыдычную справу. У той жа час чытачы, шырокая грамадскасць маюць поўнае права на ўсебаковую інфармацыю пра Алеся Бяляцкага, чыё прозвішча ў гэтыя дні гучыць з самых розных крыніц. Хто ён, адкуль родам, дзе вучыўся, які яго працоўны шлях, погляды на жыццё, палітыку — на гэтыя і многія іншыя пытанні дае адказы яго інтэрв'ю, запісанае паўтара года таму вядомым журналістам Аляксандрам Тамковічам.



(Матэрыял "Шлях Алеся Бяляцкага" чытайце на 3-й стар.)

ГУЧНАЯ СПРАВА

«Я напісаў: "Прашу вызваліць мяне ад далейшага адбыцця пакарання". І ўсё»

11 жніўня стала вядома, што Аляксандр Лукашэнка памілаваў 9 чалавек з тых, каго пакаралі за Плошчу. Прэс-служба кіраўніка дзяржавы патлумачыла, што "решение о помиловании принято на основании просьб указанных лиц, с учетом того, что они осознали противоправный характер своих действий, признали вину и искренне раскаялись".

Навіна пра вызваленне дзевяці палітвязняў імгненна з'явілася ў сацыяльных сетках і выклікала шмат каментарыяў. Людзі абмяркоўвалі, ці варта было падаваць прашэнне менавіта ў такім выглядзе. "Народная Воля" пацікавілася, як жа ўсё адбывалася насамрэч.

Дзевяць чалавек з агульнага спісу палітвязняў цяпер знаходзяцца дома. Іх абвінавацілі ва ўдзеле ў масавых беспарадках, якія, па версіі абвінавачання, мелі месца ў беларускай сталіцы ў дзень галасавання на прэзідэнцкіх выбарах. Гэта **Зміцер Дрозд, Арцём Грыбкоў, Сяргей Казакоў, Яўген Сакрэт, Васіль Парфянкоў, Уладзімір Яроменак, Віталь Мацукевіч, Аляксандр Квяткевіч** і апошні памілаваны **Уладзімір Хамічэнка** (падчас следства яму далі мянушку "Навушнік").

Усе яны распавядаюць, што два тыдні таму ў суботу да іх прыйшлі прадстаўнікі турэмнай адміністрацыі і прапанавалі напісаць заяву з просьбай аб вызваленні. Ва ўсіх гэта адбывалася прыкладна аднолькава. Сяргей Казакоў адбываў пакаранне ў Бабруйскай папраўчай калоніі. "Узору мне ніякага не давалі. Спыталі, хто мае сваякі і ці хачу я дадому. Я адразу зразумеў, што да чаго. Як я зразумеў, для іх нават не так важна будзе, напішу я ці не напішу, што прызнаю сваю віну і г.д. Патрэбны быў сам факт наяўнасці такой паперкі", — кажа Сяргей Казакоў, якога кінулі ў турму быццам за тое, што ён барабаніў па шчытах спецназаўцаў і спрабаваў прарвацца праз іх ланцуг.

Сяргея затрымалі не на плошчы Незалежнасці, як асноўную колькасць палітвязняў. Ён ніколі не быў у турме на Акрэсціна і ў "амерыканцы". За ім прыйшлі напрыканцы студзеня і адвезлі на Валадарку. Потым былі суд і Бабруйская папраўчая калонія...

— Вас, удзельнікаў Плошчы, у Бабруйскай калоніі было чацвёра. Вы адчувалі нейкае асаблівае стаўленне да сябе? — запыталі мы ў Сяргея.

— Толькі з боку адміністрацыі. Калі мы былі яшчэ ў каранціне, да нас увесь час заходзілі супрацоўнікі адміністрацыі з рознымі размовамі, маўляў, сядзіце ціха, а то...

Мы абмяркоўвалі з хлопцамі ўсё, што чыталі ў газетах. Дарэчы, для нас і ў каранціне была цэнзура на газеты. На практыцы гэта азначае, што нам іх не давалі. Чаму нельга было даць нам сканворды? Гэта незразумела. Але як бы там ні было, я ўпэўнены, што ў хуткім часе выйдуць усе, хто трапіў за краты ў сувязі з падзеямі 19 снежня. А тое, што мяне адпусцілі, ніякім чынам не паўплывала на маю пазіцыю. Калі было спадзяванне на тое, што людзі адседзелі паўгода, напалохаліся і будуць усё астатняе жыццё сядзець пад лаўкай, то гэта вялікая памылка. Я, наадварот, адчуваю сябе больш упэўненым. Больш даведаўся пра жыццё, асабліва пра нашу судовую і судова-выканаўчую сістэму. Раней я жыў у іншым вымярэнні і нічога не ведаў пра гэты бок жыцця. Цяпер разумею, што тут праблем ці не больш, чым на волі. Я быў перакананы, што хутка буду на свабодзе.

У Бабруйскай калоніі з чатырох удзельнікаў Плошчы на волю выйшлі трое. За кратамі застаецца Андрэй Пратасеня. Яму адміністрацыя не прапаноўвала напісаць заяву. Не зразумела, якімі матывамі кіраваліся супрацоўнікі Дэпартамента выканання пакаранняў, калі прапанавалі зрабіць гэта аднаму з трох палітвязняў у калоніі "Віцьба". Прапанову атрымаў Уладзімір Яроменак, актывіст зарэгістраванага ў Чэхіі "Маладога фронту". Ён адбываў пакаранне за Плошчу разам з Аляксандрам Атрошчанкавым і Зміцерам Даронiным.

Да Яроменка таксама прыйшлі ў суботу, два тыдні таму. *"Хацелі, каб я напісаў заяву пад дыктоўку, але я сказаў, што напішу самастойна. Напісаў коратка: "Прашу вызваліць мяне ад далейшага адбыцця пакарання". І ўсё. Я спытаў, ці ўсім прапанавалі напісаць заявы, і мне адказалі, што хутчэй за ўсё я не адзіны такі"*, — распавёў Уладзімір Яроменак.

Калі Уладзімір адказваў на пытанні "Народнай Волі", ён быў у міліцыі, дзе мусіў стаць на ўлік. Былы студэнт напярэдадні 1 верасня яшчэ не ведае, дзе будзе вучыцца. На турэмныя нары хлопец трапіў з трэцяга курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Уладзімір Яроменак кажа, што выхад на волю яго, натуральна, абрадаваў, але ён нават у калоніі меў добры настрой, бо ў яго была вялікая маральная падтрымка. "Мне прыносілі стосы лістоў! Сукамернікі нават прасілі: "Валодзя, твае лісты забіваюць усю цэнзуру. З-за іх нашы доўга не прыходзяць. Папрасі сваіх сяброў, каб меней пісалі".

Цягам двух сутак не былі вядомы прозвішчы ўсіх дзевяці памілаваных палітвязняў. Апошнім на волю выйшаў Уладзімір Хамічэнка. Вакол яго асобы хадзілі розныя чуткі. У сацыяльных сетках яму далі мянушку "Навушнік" пасля фільма БТ "Плошча. Железом по стеклу". Там ён стаяў, прыклаўшы руку да вуха. Гэта дало падставы для выказванняў аб тым, што ён невыпадкова аказаўся на плошчы і ўдзельнічаў у правакацыях па загадзе нейкіх асоб. Пацвердзіць ці абвергнуць гэтую інфармацыю было немагчыма. Уладзіміра Хамічэнку судзілі разам з іншымі ўдзельнікамі падзей 19 снежня. Яго пакаралі зняволеннем на тры гады.

Указ аб памілаванні дзевяці палітвязняў па даце супаў з абвяшчэннем эканамічных санкцый ЗША супраць чатырох беларускіх прадпрыемстваў — "Белшына", "Гродна-Азот", "Гродна-хімвалакно" і "Нафтан". Зразумела, што і ўказ, і рашэнне пра санкцыі рыхтаваліся раней, але супадзенне падаецца ўзаемазвязаным і невыпадковым...

На сённяшні дзень 20 "палітычных" знаходзяцца на волі, 21 — за кратамі.

Любоў ЛУНЁВА.

«Лебядзіны» будуць інвеставаць кітайцы

Беларусь і Кітай падпісалі інвестыцыйную дамову аб рэалізацыі праекта па будаўніцтве жылога комплексу "Лебядзіны" ў Мінску. Ад беларускага боку дамову падпісаў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, а ад кітайскага — дырэктар кампаніі "БіЮСіСі" Ян Мін.

Плануецца, што інвестыцыйны праект будзе рэалізоўвацца да 2016 года. Яго арыенціровачны кошт прыкладна 200—250 мільёнаў долараў. У мікрараёне "Лебядзіны" будуць пабудаваны 33 жылыя дамы агульнай плошчай каля 180 тысяч кв.метраў. Палову кватэр пабудуюць кітайскія будаўнікі па кітайскіх праектах з элементамі кітайскай культуры. Інвестыцыі будуць паступаць з кітайскіх банкаў.

Такім чынам, цяпер можа быць пастаўлена кропка ў справе інвестыцый і забудовы мікрараёна "Лебядзіны". Дагэтуль было дастаткова шмат інфармацыі наконт будаўніцтва шматпавярховак расійскай кампаніяй "Интеко", якая належала жонцы былога мэра Масквы Юрыя Лужкова Алене Батурынай. Гэтая асоба мела ў беларускай сталіцы шэраг буйных праектаў у такой звышпрыбытковай сферы, як будаўнічы бізнес. Руская служба "Радио Свобода" паведамляла раней аб тым, што менавіта будаўнічая фірма "Итерабелстрой", якая з'яўлялася даччынай кампаніяй холдынга Батурынай "Итера Девелопмент Груп", пачынала будаўніцтва першага ў Беларусі хмарачоса на сталічнай вуліцы Кальварыйскай, які назвалі "Ветразь". Будаўніцтва вялося таксама на праспекце Дзяржынскага і ў мікрараёне "Лебядзіны". Апроч таго, планавалася будаўніцтва шэрагу гіпермаркетаў з падземнымі паркоўкамі, кінатэатрамі і рэстаранамі.

Любоў ЛУНЁВА.

С 1400 до 2100

В Минске планируется увеличить размеры бюджетных доплат на питание школьников.

По словам председателя комитета по образованию Мингорисполкома **Владимира ЩЕРБО,** в прошлом учебном году бюджетные расходы на питание в день на одного учащегося столицы составляли 1,4 тысячи. С 1 сентября планируется эту цифру увеличить до 2,1 тысячи в день. На эти цели из бюджета города в 2011 году потребуется дополнительно 672 млн рублей, в 2012-м — 1 млрд 512 миллионов.

СТЫХІЯ

Вёска ледзьве не сышла пад ваду

Больш за 60 чалавек былі эвакуіраваны, 50 выратаваны ад затаплення, адзін мост разбураны — вынікі нядзельнай навальніцы ў Валожынскім раёне.

Увечары 14 жніўня моцны дождж ледзьве не стаў прычынай разбурэння вёскі Студзёнка.

У Валожынскім раёне раптам выпала 45 міліметраў ападкаў пры месячнай норме 81 міліметр. Націску стыхіі не вытрымала дамба, і вада са сховішча і ракі Валожынка ледзь не паглынула вёску. Затоплена 85 хат.

Моцныя навальніцы з градам прайшлі па ўсім цэнтры нашай краіны. Сіноптыкі прагназуюць дажджы да канца тыдня.

Дарагі і любімы наш муж, тата і дзядуля, Іван Мікалаевіч Ёрш!

Віншуем цябе з юбілеем, зычым моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця!

Жонка, дзеці і ўнукі.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16 ЖНІЎНЯ 2011 г.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Абяцалі стабілізацыю — атрымалі «стабілізец»...

26 красавіка міністр эканомікі Мікалай Снапкоў даводзіў журналістам: “Мы ўпэўнены, што да сярэдзіны года цэны (маюцца на ўвазе цэны на харчовыя тавары. — Аўт.) збалансуюцца і знойдуць сваю раўнавагу, у тым ліку ўплываючы на індэкс спажывецкіх цэн у цэлым”. Час ляціць, і вось — сярэдзіна жніўня. Дзе ж тая збалансаванасць і стабілізацыя?

Каб не шукаць яе навобмацак, нібыта чорнага ката ў цёмным пакоі, шапінгую нядзельным ранкам па прадуктовых лаўках, рынках і гіпермаркетах. Атрымаў ад сваёй палавіны і канкрэтнае заданне — купіць паўкіло маладой ялавічыны, пажадана цяляціны...

Прадуктовы магазін **“Стольны”** на сталічнай вуліцы Рафіева — зусім побач, таму кірую проста ў мясны аддзел. Некалі ў гэтую краму ехалі з усіх канцоў Паўднёвага Захаду, бо асартымент мясных вырабаў ды розных далікатэсаў быў такі, што ад аднаго паху перасмыкала ў вантробах. Але калі тое было?.. Цяпер і машын на паркоўцы паменела, і людзей у краме не густа. Нават ядраны пах саланіны і свежаніны некуды выветрыўся, быццам рэцираваўся разам з праклятым доларам. Але ж хачу ўпэўніцца, што “збалансаванасць” — у наяўнасці, вярнулася, халера, на свае зыходныя пазіцыі. Ну як не паверыш дзяржаўнаму начальніку, які так навукова-даступна растлумачыў спажывецкаму класу праз журналісцкі пул: цэны на харч у Беларусі, па-першае, носяць спекулятыўны характар, па-другое, дэвальвацыйны характар і, нарэшце, характар знешняга фактару. Апошняе трэба разумець так: калі падвышаюцца сусветныя цэны на харч, на асноўныя сыравінныя тавары, то, натуральна, павялічваюцца цэны і на асобныя харчовыя тавары ў Беларусі. Але ёсць яшчэ адзін закон эканомікі, а менавіта: **тавар павінен каштаваць столькі, колькі пакупнік гатовы за яго заплаціць**. Толькі ці гатовы беларус (асабліва пенсіянер, а такіх больш за два з паловай мільёны) выкласці свае кроўныя за тое, што яшчэ ўчора было ўтрая танней? Рытарычнае пытанне... Хаця за тую ялавічыну, што выстаўлена ў “Стольным”, можа, нехта і рызыкне заплаціць 17.830 рублёў — кошт па нашым часе не вельмі высокі. Але якасць прадукту (нават візуальна ацэньваючы) адпужвае: мяса счарнелае, старое, касцістае... Разглядваючы небагаты ялавічны асартымент (ногі-капыты былога гавяда па 1830 руб. ды яшчэ гэта счарнелае мяса), пажылая цётка з горыччу прамаўляе: “Пасаромеліся б прадаваць такое, на яго страшна глядзець, не тое што купляць...”

Дзеля аб’ектыўнасці адзначу: розных каўбас, паляндвіц ды ўсяго астатняга, што мае жывёльнае паходжанне, у “Стольным”, роўна як і ў астатніх крамах, хапае. Але зноў жа — цэны... Кошт філею свініны, напрыклад, перавышае 43 тысячы за кіло, а быхаўская сыравяленая і ўвогуле паставіла цэнавы рэкорд — 71.790 рублёў за кіло. Цяляцінай, натуральна, і не пахне... Таму еду далей — у **“MAXIMUM”** па вуліцы Ясеніна, там рынак, там прыватнік...

Велізарны мясны павільён малалюдны, прадаўцы просяць-моляць купіць у іх тое-сёе... Але пакупнікоў мала, быццам адразу ўсе сталі вегетарыянцамі... І што дзіўна, у наяўнасці толькі свініна, сала, каўбасы, вэнджаніна. Ялавічыны ўвогуле не відаць. Нарэшце, добра пакругаляўшы, згледзеў-такі ялавічыну — у адной-адзінай прадаўшчыцы. Са страхам узіраюся ў цэннікі: лапатка — 65 тысяч за кіло, шыя — таксама 65 тысяч. Не слаба!

— А цяляціна ёсць? — пытаюся ў маладзіцы.

— Няма, нідзе вы яе не знойдзеце, — адказвае тая. — Купіце тое, што прапаную: мяска, самі бачыце — пальчыкі абліжаце...

— А куды ж падзелася цяляціна?

— Гойсае па полі, траву шчыпае, — кідае ўжо наўздагон языкастая кабета.

Гойсае дык гойсае... Можа, у **“Прастор”** завезлі тую цяляцінку, усё ж такі гіпермаркет. Трымаю курс туды. Пакуль ехаў у канец Ясеніна, успомніў анекдот часоў брэжнеўскага застою і татальнага дэфіцыту. Мужык трапіў у Маскву, стаіць на Краснай плошчы і круціць галавой ва ўсе бакі. Міліцыянт пытае: “Таварыш, вы згубіліся ці нешта шукаеце?” — “Шукаю, дарагі, шукаю...” — “А што менавіта?” “Краму прадуктовую — называецца “Прынцып”... Леанід Ільіч казаў, што “ў “Прынцыпе” ў нас усё ёсць, от я і прыехаў...

У “Прасторы”, у прынцыпе, таксама ўсё ёсць... Асабліва багаты выбар кулінарных вырабаў. Напрыклад, “Свініна французская” — па 63.710 рублёў, “Свініна з ананасам” — па 71.040 рублёў, курыца “Ням-ням” — па 39.320 за кіло, свініна натуральная — па 52.920 рублёў і гэтак далей. А дзе ж мясныя вырабы са скідкамі для сацыяльна не абароненых грамадзян — пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетных сямей? Наколькі ведаю, Мінгарвыканкам і гандлёвыя арганізацыі распрацавалі і задзейнічалі праграму стрымлівання росту цэн якраз з мэтай падтрымаць гэтую катэгорыю людзей. Была падпісана і адпаведная дамова з 250 сталічнымі магазінамі, у тым ліку з сеткай магазінаў “Прастор”. Дамова-праграма распаўсюджвалася на 16 таварных груп, уключаючы мясную... Але нешта не відаць у “Прасторы” танных мясных вырабаў для пенсіянераў. Тут наогул не аказалася ніякай ялавічыны. Пра цяляціну, у прыватнасці, і гамонкі няма...

Што ж рабіць — ехаць на **Камароўку** ці дамоў з пустымі рукамі? На Камароўцы, як у парыжскім гандлёвым чэраве, ёсць амаль усё. Праўда, на тысячудругую танней, чымся на перыферыйных рынках. Пенсіянеры, нават ведаючы гэта, не надта пруцца цяпер на галоўны рынак сталіцы. Ну, купіш кавалак мяса, выкладзеш на якую тысячу меней, чым у сваім раёне... Але ж праездзіш болей, бо транспарт падаражаў, а былыя льготы карова языком злізала... От і не рыпайся, жыві ў сваім раёне-клетцы і шукай, што табе па кішэні. Нарэшце, у галаву прыходзіць выратавальная думка: а наведаю я адну дзівосную прадуктовую крамку пад назвай **“Мясной смак”,** што ў раёне вуліцы Гурскага. Там заўсёды быў багаты выбар, усё свежае, прывабнае... Еду. Успамінаю, як першы раз наведаў гэты “Смак” гады два таму, як уразіўся асартыменту, абыходжанню гасцінных прадаўшчыц. Адзінае, што засмуціла, — не вельмі ўдалая назва крамы. Калі ўжо вырашылі назваць краму па-беларуску (што пахвальна і што мяне насамрэч усцешыла), то варта прытрымлівацца літаратурнай мовы, а не трасянкі, бо ўсё-такі не “Мясной смак”, а “Мясны смак”... Але гэта так, да слова. Цяпер галава задурана іншым — некуды зніклай цяляцінай. Няўжо і тут няма? Насцярога пацвердзілася: некалі забітая мяснымі далікатэсамі вітрына-лядоўня — амаль пустая, хоць шары катай. Прадаўшчыца Зоя Мікалаеўна — абаяльная гаваркая жанчына з гатоўнасцю пракаменціравала сітуацыю: ялавічыны, асабліва цяляціны, няма ва ўсім горадзе. “Вось апошняе, што маем, — прапанавала з таго, што засталося, — маладзенькая ялавічынка для студня па 35 тысяч 900 рублёў за кіло. Сакавітая, амаль без костачак. Бярыце, не пашкадуеце”. Узяў. Але што скажу сваёй палавіне? Заданне ж не выканаў...

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

ВЕРЫЦЬ — НЕ ВЕРЫЦЬ

Дэфіцыту мяса не будзе

Учора такую заяву зрабіў прэм’ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч.

Ён заявіў, што ўчора раніцай на пасяджэнні апаратыўнага камітэта разглядаліся пытанні, звязаныя з пастаўкамі мяса для Мінска. *“Ёсць варыянты рашэння, яны не патрабуюць вялікіх выдаткаў”,* — цытуе Мясніковіча БЕЛТА.

Прэм’ер-міністр дадаў, што мясакамбінаты і гаспадаркі, вядома, сёння добра разумеюць, што прадаваць сваю прадукцыю на экспарт выгадна. *“Аднак мы не павінны забывацца пра ўнутраны рынак”,* — падкрэсліў ён.

АКТУАЛЬНА

А вашы заробкі так павышаліся?

Цэны на прадукты харчавання ў Беларусі толькі за першае паўгоддзе выраслі на 27,1%. Летам рост цэн у шмат разоў апярэдзіў тэмпы павышэння заробкаў і пенсій.

Крызіс у краіне пачаўся з грэчкі. Кошты на гэтыя крупы яшчэ мінулай восенню падскочылі ледзьве не ўтрая. За ёй падцягнуліся і іншыя прадукты. Дэвальвацыя ў сваю чаргу збіла ўзровень пакупніцкай здольнасці да стану “страшна зайсці ў краму”.

Сярэднія па Беларусі кошты на прадукты харчавання

Прадукт/ Месяц	Цукар-пясок 1кг	Алей 1 л	Кава “Нескафе” 100 г
студзень	2990	4800	9 000
люты	3280	5200	10500
сакавік	2300	5800	11000
красавік	3600	7260	15000
май	4880	8700	25100
чэрвень	5000	11000	22 000
ліпень	5000	11370	36000
жнівень	5000	13760	43800

Такім чынам, згодна з паведамленнямі Белстата, за першыя шэсць месяцаў 2011 года
цукар падаражаў на 42,4%,
кава — на 38,8%,
рыба і рыбапрадукты — на 36,6%,
масла жывёльнае — на 30,1%,
безалкагольныя напоі — на 24,9%,
сыры — на 23,6%,
макаронныя вырабы — на 22,7%,
мяса и мясапрадукты — больш як на 21%.

Зусім нядаўна ў Беларусі падвысілі пенсіі. Але ўсяго толькі на 13%. А кашалькі працуючых не пацяжэлі нават і на столькі. Напрыклад, настаўнікі з сярэднім заробкам у 1,5 мільёна рублёў атрымалі індэксацыю за крызісны май 40 тысяч.

Дык у каго заробкі растуць прапарцыянальна коштам?

Марыя МАЛЕВІЧ.

ИНИЦИАТИВА

Рубинов предложил превратить «Белую Русь» в партию

О новой инициативе председатель Совета Республики Анатолий Рубинов заявил в Шклове на встрече с активом районной организации общественного объединения “Белая Русь”.

Рубинов заявил, что партией готова стать “Белая Русь”.

“Бесспорно, вся инициатива должна исходить от людей, — цитирует Рубинова БЕЛТА. — *Но по настроению я понимаю, что организация созрела к тому, чтобы повысить свою политическую роль, более активно проявлять себя”.*

По словам Рубинова, когда-то белорусы, желающие активно участвовать в общественной жизни, инициировали создание “Белой Руси”. Следовательно, надо понимать, не будет ничего удивительного и в том, что снизу появится инициатива превратить общественное объединение “Белая Русь” в партию власти. Видимо, кому-то очень хочется создать в Беларуси структуру наподобие российской “Единой России” или советской КПСС.

К слову, Республиканское общественное объединение “Белая Русь” было создано 17 ноября 2007 года. За несколько лет численность провластной организации превысила 120 тысяч человек.

ПРАПАНОВА!

У выбарчыя камісіі — новых людзей!

Улічваючы сённяшнюю сітуацыю ў Беларусі і прымаючы пад увагу шматлікія паразы апазіцыі ў выбарчых кампаніях, у мяне саспела думка наконт таго, як працаваць на перамогу той частцы грамадства, якую хвалюе лёс краіны. Па-першае, трэба рубам ставіць пытанне перад уладамі аб унясенні змен у Выбарчы кодэкс. Так, у склад выбарчай камісіі не павінна ўваходзіць больш за 15 працэнтаў членаў адной арганізацыі ці ўстановы. Нельга дапусціць, каб у выбарчых камісіях было болей за 5 працэнтаў тых, хто працаваў у іх падчас мінулых выбараў. Фактычна камісіі павінны быць сфарміраваны з новых людзей.

Пры падліку галасоў кожны сябар выбарчай камісіі павінен бачыць кожны бюлетэнь, а не працаваць паасобку са сваім стосам бюлетэняў і перадаваць лічбы на паперцы старшыні камісіі.

Назіральнікі павінны мець магчымасць без абмежаванняў назіраць увесь працэс выбараў і падліку галасоў. Нідзе такога няма, каб вышэйшая камісія магла “папраўляць” лічбы падліку галасоў, зробленага ніжэйшымі камісіямі. Усё павінна матэматычна складвацца і падлягаць кантролю на ўсіх ступенях выбарчага працэсу.

Добра было б, каб “кантрольнай ініцыятывай” была ахоплена як мага большая частка грамадства, зрабіўшы максімальны інфармацыйны націск на сябраў камісій. Адным словам, усе арганізатары выбараў павінны быць пад дзейсным кантролем.

Да чарговых парламенцкіх выбараў засталося мала часу. І мяне здзіўляе, чаму лёсавызначальныя праблемы ў Беларусі не вырашаюцца.

Міхась ВАСІЛЕЎСКІ,
мінчанін.

Наркотыкі наступаюць...

Ананімнае анкеціраванне-апытанне школьнікаў, праведзенае ў Мінскай вобласці, засведчыла: 30 працэнтаў падлеткаў альбо спрабавалі ўжываць наркатычнае зелле, альбо дакладна ведаюць, хто гэтым злоўжывае.

Па словах начальніка УУС Мінаблвыканкама Івана Саўчыца, амаль палова нарказалежных у сталічнай вобласці з’яўляюцца жыхарамі Салігорска. Шахцёрскі горад разам з суседнім Слуцкам лідзіруюць і ў распаўсюджванні наркотыкаў у рэгіёне. Праблема набыла востры характар, паколькі на пачатку года на ўліку стаялі 1220 чалавек, а зараз ужо 1276. З іх 530 — у горадзе Салігорску.

“Мы ўпусцілі Салігорск, мы ўпусцім і Слуцк”, — несуцяшальны прагноз Івана Саўчыца. Міліцэйскі начальнік упэўнены, што неабходна ўводзіць ранняе тэсціраванне для школьнікаў на лаяльнасць да наркотыкаў. Але міліцэйская прапанова не знайшла падтрымкі з боку беларускіх парламентарыяў. Як будзе далей — не зусім ясна. А што тычыцца новаяўленых цэнтраў рэабілітацыі, то, па словах таго ж Івана Саўчыца, ён “не бачыў ніводнага чалавека, які б вылечыўся ад нарказалежнасці”.

ПАЛІТВЯЗНІ

Павел СЕВЯРЫНЕЦ: «Баяцца, што я буду арганізоўваць мітынгі...»

Павел Севярынец, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”, асуджаны да трох гадоў “хіміі”, зараз знаходзіцца ў вёсцы Куплін Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Менавіта тут палітык будзе адбываць пакаранне.

Аб першых днях знаходжання на “хіміі” ён распавёў карэспандэнту “Народнай Волі”.



“Вёска Куплін знаходзіцца ў трох кіламетрах ад Пружан, — *расказаў Севярынец.* — Тут на тэрыторыі былога вайсковага гарадка знаходзіцца спецкамендатура, дзе людзі, асуджаныя да “хіміі”, адбываюць пакаранне. Агулам нас чалавек сто. Пераважная большасць працуе ў Пружанах. Я пакуль беспрацоўны. Мяне нават не выпускаюць у горад, магчыма, не хочуць, каб я самастойна шукаў працу.

Прыбыўшы на месца, я сказаў, што мая спецыяльнасць — інжынер-геолаг, аднак магу працаваць і пісьменнікам, і журналістам. Але ж, паўтаруся, у горад мяне не выпускаюць — ні ў мясцовы краязнаўчы музей, ні ў бібліятэку. Працу самастойна я знайсці сабе не магу, а размеркавання на мяне яшчэ няма. Пры гэтым прычыну, па якой мяне не адпускаюць у горад, не тлумачаць. Магчыма, тутэйшае начальства баіцца, што я буду арганізоўваць мітынгі...

Я напісаў заяву з просьбай даць магчымасць працаўладкавацца — цішыня. Таксама напісаў паперу, у якой папрасіў дазволу раз на тыдзень наведваць мясцовую царкву — таксама маўчанне. Складваецца ўражанне, што ўсе рашэнні адносна мяне прымаюцца не кіраўніцтвам спецустановы, а недзе ў іншых кабінетах...

Пакуль я пазбаўлены магчымасці працаваць, у мяне, калі можна так сказаць, ёсць дастаткова вольнага часу. Пішу лісты палітзняволеным, працягваю працу над уласным раманам “Сэрца святла”.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

НЕЗАВІСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Россия вновь бросает спасательный круг

В который раз Россия бросает спасательный круг белорусским властям. Сбербанк РФ и Deutsche Bank предоставляют кредит “Беларуськалию” на 2 млрд долларов. Собственно, “Беларуськалий”, я считаю, в таком кредите не нуждается. Это кредит белорусскому правительству. Понятно, что данные миллиарды будут направлены на пополнение валютных резервов государства, как, вероятно, и 300 млн долларов кредита “Беларуськалию” от Азербайджана.

Россия уже не желает в очередной раз кредитовать Беларусь из своего бюджета, поэтому внешне это кредит одних субъектов хозяйствования другим. Но не надо забывать, что российский Сбербанк — по сути, государственный банк. Как заявлено, в качестве обеспечения по кредиту будут предоставлены экспортные контракты, а главное, 35% акций “Беларуськалия”.

Напомним, А.Лукашенко оценивал стоимость самого крупного белорусского актива в 30 млрд долларов. Тогда, если кредит в 2 млрд долларов мы не сумеем возвратить, то 35% акций, а это 10,5 млрд долларов, перейдут в собственность кредиторов.

По информации других источников, реальная стоимость “Беларуськалия” составляет 20 млрд долларов. В таком случае стоимость залога тоже не хилая — 7 млрд долларов. Отсюда имеют резон мнения аналитиков, что белорусское правительство закладывает самый ценный актив страны за бесценок.

Это говорит и о другом: белорусским властям валюта в миллиардных суммах нужна здесь и сейчас, нужна как воздух. В первую очередь необходимо нормализовать ситуацию на валютном рынке. После установившихся курсов белорусского рубля в 6000 за доллар на черном наличном рынке и 7000 на сером безналичном, в последние дни “зеленый” вновь рванул. Думается, немалую роль в этом деле сыграли высказывания нового главы Нацбанка о том, что населению можно жить и без валюты, как это делается в некоторых странах. Нечаянно оброненные слова, брошенная фраза подтолкнули девальвацию реального долларового курса рубля. У валютчиков и на интернет-бирже он достиг 7000—7300, безналичный курс на теневом внебиржевом рынке также отреагировал: за доллар предлагают 7500—8000 белорусских рублей. Курс евро в “народном интернет-обменнике” prokopovi.ch перешел психологический рубеж в 10.000 рублей.

Чем больше отдаляются эти курсы от официального нацбанковского, тем сложнее будет монетарным властям переходить на единый валютный курс рубля к мировым валютам. А этот процесс неизбежен. Тем более что у Нацбанка есть бесценный опыт пошагового перехода к единому курсу рубля с осени 1999-го по сентябрь 2000 года, когда цель была достигнута. В то время официальный курс доллара вырос с января по сентябрь 2000 года с 320 до 1020 рублей, т.е. в 3,2 раза.

Осенью белорусская и российская стороны должны договориться об условиях продажи второй половины “Белтрансгаза”, и Нацбанк в свои резервы зачислит еще 2,5 млрд долларов. Вероятней всего, не сразу, а частями (траншами), как это было при расчетах за первую половину акций “Белтрансгаза”. Специалисты оценивают дефицит торгового баланса текущего года в сумму не менее 9 млрд долларов. Во всяком случае, с учетом этих сделок у Нацбанка и правительства открываются неплохие перспективы нарастить валютные резервы и перейти к единому курсу рубля и свободной торговле валютой. Если учесть, что осенью придет второй транш от Антикризисного фонда ЕврАзЭС в размере 440 млн долларов, то заимствованные объемы золотовалютных резервов могут вновь позволить Нацбанку обрести роль продавца на валютной бирже, поддерживать реальные обменные курсы белорусского рубля и профинансировать отрицательное сальдо внешней торговли.

То, что этот процесс нельзя затягивать, показывает не только усиление девальвации белорусского рубля на различных сегментах валютного рынка, но и не утихающая инфляция, которая, как известно, имеет сезонный характер и после летнего затишья вновь начинает раскручиваться. Вот некоторые итоги. Потребительские цены на товары и услуги в июле в исчислении к июлю прошлого года (в годовом исчислении) выросли на 48,4%. Цены на продовольственные товары в годовом исчислении увеличились на 55,6%, цены и тарифы на платные услуги — на 25,8%. Цены производителей промышленной продукции — на 72,9%. Это означает лишь одно: уровень жизни населения падает просто катастрофически. К тому же текущий 2011 год — последний год, когда обслуживание внешнего долга Беларуси укладывается в сумму порядка 700 млн долларов. По последним данным, в будущем году стране по внешним долгам (МВФ, России, по облигациям Минфина и т.д.) потребуется выплатить 1,8 млрд долларов, в 2013 году — 3,1 млрд долларов, в 2014 — 3,2 млрд и в 2015 году — 2,7 млрд долларов. Откуда власти возьмут такие деньги — никто не скажет.

Нацбанк и правительство принимают определенные меры для защиты экономики и населения от инфляции. Правительство индексирует зарплаты, главный регулятор в очередной раз на 2% (до 22%) поднял ставку рефинансирования. Однако они явно недостаточны. Ставка рефинансирования продолжает находиться глубоко под уровнем инфляции. Равно отрицательны все реальные депозитные проценты коммерческих банков. Но наиболее обеспеченным слоям населения попросту некуда девать свои рублевые доходы. Валюту законными путями не купишь. Может, отдельных не очень финансово просвещенных потенциальных вкладчиков и завораживают 30%-ные рублевые годовые ставки. В июле рублевые депозиты выросли на 11,7%. Они все же хоть частично компенсируют инфляцию. Валютные замерли практически на одном уровне. Денежные власти, надо полагать, опасаются, что при освобождении валютных курсов рубля от административных пут, учитывая огромный отложенный спрос на валюту со стороны населения и бизнеса, они, курсы, могут так “выстрелить”, что начнется очередной массовый отток банковских ресурсов с рублевых вкладов.

Сложившуюся ситуацию в нашей экономике можно окрестить не иначе как белорусским феноменом. Это должно войти в экономическую историю: обвальное обеднение народа при показательном росте производства. Как будто белорусы, как немцы после поражения в войне, начали платить какую-то контрибуцию. За январь—июль ВВП Беларуси увеличился на 9,8%. Но толку-то? Ведь главные выплаты по долгам еще впереди. Скорее всего недалекое будущее покажет, что время работает против нас.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16 ЖНІЎНЯ 2011 г.

Ставка — 22 процента

Ставка рефинансирования Национального банка с 17 августа 2011 г. увеличивается на 2 процентных пункта — с 20 до 22 процентов годовых.

"Последовательное увеличение ставки рефинансирования, которое проводится на протяжении всего 2011 года, направлено на повышение стоимости заемных денег в экономике как важного условия поэтапного ужесточения денежно-кредитной политики НБ РБ. В комплексе с общими экономическими мерами правительства такое ужесточение будет способствовать стабилизации ситуации во внешнеэкономической сфере и ограничению инфляционных процессов... По мере развития позитивных тенденций в экономике и на финансовом рынке НБ РБ вернется к практике постепенного снижения ставки рефинансирования", — говорится в пресс-релизе Нацбанка.

Предыдущее повышение ставки также на 2 процентных пункта было произведено с 13 июля текущего года. Это уже седьмое повышение ставки в текущем году с 10,5 процента на начало года.

СЛЫШАЛИ?

За валюту

Мингорисполком планирует строить коммерческое жилье и продавать его за валюту.

В настоящее время власти города подбирают 10 площадок, на которых "МАПИД" может построить коммерческое жилье, возможно, за валюту, сказал зампред горисполкома **Сергей Радоман**. Соответствующее предложение горисполком уже внес главе государства. Даны поручения правительству и Нацбанку проработать этот вопрос.

"Мы знаем, что валюта у населения есть, и ее нужно выгодно вложить. Сегодня продажная цена в городе снизилась: коммерческие организации-застройщики продают жилье от 1,1 тыс. долларов в эквиваленте за 1 кв.метр. Если "МАПИД" будет строить по 800—900 долларов, думаю, такое жилье будет востребованным", — подчеркнул Сергей Радоман.

АФІЦЫЙНА

Больш за тры мільярды долараў

На 1 жніўня аб'ём валютных дэпазітаў фізасоб у банках Беларусі склаў 3,54 мільярда долараў. Гэта на 19,2% менш, чым на пачатак года.

Праўда, у ліпені зафіксаваны хоць і невялікі (на 1,6%), але прыток дэпазітаў насельніцтва ў валюце пасля змяншэння на працягу чатырох папярэдніх месяцаў. Цікава, але павялічыліся і ўклады ў нацыянальнай валюце. На пачатак жніўня яны склалі 10,96 трыльёна рублёў, павялічыўшыся на 841,1 мільёна ў ліпені.

Паедзем па новых тарыфах

"Мінсктранс" зноў павялічыў тарыфы на рэйсы па міжгародніх маршрутах. Гэтым разам на 5—15%.

З перадапошняга павышэння прайшло толькі два месяцы: 9 чэрвеня "Мінсктранс" павышаў ужо кошт праезду на 15—20%.

Больш беларускіх цукерак!

Падчас наведвання кандытарскай фабрыкі "Камунарка" прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч заявіў: "Атрымліваецца, што імпартуем 60 тысяч тон кандытарскіх вырабаў, а на экспарт пастаўляем 30—35 тысяч тон. Такім чынам фарміруецца адмоўнае сальда".

М.Мясніковіч запатрабаваў, каб беларускія фабрыкі рэзка павялічылі аб'ёмы вытворчасці кандытарскіх вырабаў і іх экспарт.

АСОБА

Шлях Алеся Бяляцкага

Гэта інтэрв'ю-маналог было некалі запісана для кнігі "Лёсы" і ніколі не друкавалася ў перыядычнай прэсе. Вярнуцца да яго зараз прымусілі пэўныя абставіны з яго арыштам і галоўным чынам тое, што вельмі паважаны мною Алесь Бяляцкі з'яўляецца тым даволі рэдкім беларускім апазіцыянерам, які ўмее не толькі прыгожа размаўляць, але і робіць нешта канкрэтна карыснае для людзей.

Першыя крокі

Нарадзіўся 25 верасня 1962 года ў Карэліі, у мястэчку Вяртсіля Сартавальскага раёна. У савецкія часы ў Сартавалах рабілі вядомыя на ўсю краіну лыжы. На іх тады каталіся даволі многія. Патлумачу, чаму так далёка, бо я з беларускай сям'і.

Пасля савецка-фінскай вайны трэба было асвойваць далучаныя тэрыторыі, і ў запрыгоненых савецкіх сялян з'явілася магчымасць вырвацца з "калгаснага раю". Заможная некалі сям'я Бяляцкіх пасля калектывізацыі ператварылася амаль у жабрацкую. На пачатак 1940 года шасцёра дзяцей майго дзеда Усціна пачалі пухнуць ад голаду, бо літаральна не было чаго есці, ён вырашыў пакінуць родныя месцы, Рагачоўшчыну, і паехаў "па вярбоўцы" на "акупіраваныя землі".

Так мой бацька Віктар Усцінавіч (1929 года нараджэння) у дзесяцігадовым узросце апынуўся за Ладагай. Маці, Ніна Аляксандраўна Кавальчук, родам з Нараўлянскага раёна. У Карэлію яна трапіла таксама па вярбоўцы, але толькі па іншай. Было гэта пасля Другой сусветнай вайны. Мяне назвалі ў гонар майго дзеда. Спачатку ён быў у партызанах, а потым "знік без вестак" на фронце.

Пазнаёміліся бацькі там і ажаніліся ў 1956 годзе, а ў 1964 годзе, калі мне было два гады, вярнуліся ў Беларусь. Аднак першыя дзіцячыя ўспаміны звязаны менавіта з Карэліяй. Добра памятаю свой дзіцячы садок, шум рэчкі, праз якую па мосце мяне везлі на вазку ў яслі, і скалы вакол. Памятаю пажар, які я зрабіў на варыўні, наклаўшы на электрычную плітку газет і ўключыўшы плітку, а потым, калі яны загарэліся, а ад іх і фіранкі, пабег у спальню, паскардзіўся спячай пасля начной змены маці і паспяхова ўцёк да суседзяў на першы паверх.

У тыя часы ў Беларусі пачалі будавацца заводы, якім былі патрэбны рабочыя кадры. Мае бацькі выбіралі паміж шахтамі Салігорска і хімзаводам у Светлагорску. Паехалі ў Светлагорск Гомельскай вобласці, бо ён знаходзіўся бліжэй да Рагачова і Нароўлі. З ім і звязана свядомая частка майго дзяцінства.

Жыць не было дзе, і рабочым дазволілі будаваць "времянки". Будавалі з усяго, што трапляла ў рукі, з дошак, заваліны засыпалі зямлёю. Зімою вецер аж гудзеў у шчылінах, мышы бегалі па падлозе. Адну я славіў і паднёс маці ў падарунак. У нейкім сэнсе я быў фаермэнам. Зараз "времянок" ужо няма, а раней каля вакзала паўз чыгунку там былі сапраўдныя трушчобы. Дык вось я падпальваў сваю "халупу" разы з тры. У савецкія часы дзіцячыя садкі былі перапоўнены, падзець мяне не было куды, таму аднаго пакідалі ў хаце, старэйшы брат ішоў у школу, а бацькі на працу. Кожны раз яны баяліся, што я згару разам з домам, і кожны раз Бог мяне абараняў. Неяк я знаходзіў запалкі і рабіў пажары. Шанцавала. То суседзі заўважаць, то сам уцяку, калі нешта пачынала "тлець" і з'яўляўся першы дым. Зачынены ў хаце, адзін раз разрэзаў нажніцамі абіўку радыёпрымача з матэрыі, шукаў там маленькага чалавечка, другі раз вываліў на ложак зямлю з вазона, а саму кветку парэзаў на дробныя кавалкі, так было прыгожа — чорная зямля на белай прасціне і зялёная кветка на ёй.

Вельмі любіў лазіць па дрэвах. Забіраўся высока-высока, і ніхто не мог зняць. "Прыманьвалі" цукеркамі. Унізе чакала вялікая крыўда, бо замест абяцаных цукерак атрымліваў па адным месцы.

У мяне быў любімы сабака Тузік. Часам ён прыносіў з лесу крыху прыдушаных зайцоў. Дарэчы, наша "времянка" стаяла сярод хваёвага лесу. Я любіў самастойна вандраваць — то на недалёкі чыгуначны вакзал траплю, то ў лесе заблукаю, то яшчэ пайду куды, і бацькі баяліся, каб не здарылася нешта трагічнае.

Яны палохалі тым, што калі-небудзь мяне скрадуць цыганы. А цыганы тады жылі на вакзале і часта хадзілі паўз нас. Аднойчы на дарозе я заўважыў дзвюх цыганак і падумаў, што гэта за мной. Сказаў Тузіку: "Фас!" — і кінуўся ў атаку. Бедныя цыганкі...

Як чалавек, які вырас не "на асфальце", вельмі любіў збіраць грыбы. Асабліва калі быў у бабулі па маці, у Красноўскай Будзе. За Нароўляй такія лясы! Побач мяжа з Украінай і грыбнікі хадзілі тудысюды. Больш за 200 баравікоў ніколі не браў — не данесці. Цяпер так рабіць немагчыма. Чарнобыль.

У тыя гады стаў чытаманам, якім з'яўляюся і па сёння. Пры гэтым ніхто мяне чытаць не вучыў. Асвоіў усё сам. У пяць гадоў па буквары пытаўся ў старэйшага брата: а што гэта за літара, а якая гэта? Потым пачаў чытаць, і бацькі здзівіліся. Да пятага класа любіў біцца, не ведаў страху і рабіў гэта паспяхова, бо ніхто не чакае ўдару ад ляўшы. А потым так захапіўся кнігамі, што стаў больш часу праводзіць у кватэры.

З ляўшы зрабілі праўшой, прымусілі пісаць правай, таму на савецкую сістэму выхавання ў мяне крыўда (смяецца. — **Заўвага аўтара.)** з маленства.

У яслях.

Выбар лёсу

У Светлагорску скончыў сярэднюю школу №5. З першага да апошняга класа адвучыўся там, а жыў праз дарогу. У першы клас у школу пайшоў сам, без бацькоў, не хацеў, каб яны ішлі са мной. Вучняў было шмат, таму патрапіў я аж у першы "і". Клас у нас быў вельмі дружны. Ужо ў старэйшых класах ездзілі на бульбу, на буракі, самавольна хадзілі ў паходы. Не толькі ў школе, але і па-за ёй мы ўвесь час "тусаваліся" разам. Што толькі не рабілі!.. Напрыклад, разам выпілі шмат партвейну. Дарэчы, паступілі ў інстытуты і ўніверсітэты потым амаль усе, бо вучыліся добра.

Я абраў Гомельскі ўніверсітэт, дакладней, беларуска-рускае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта.

Правучыўся там пяць гадоў. Кампанія ў нас была вельмі цікавая, бо разам са мной вучыліся Анатоль Сыс (на два гады старэйшы), Эдуард Акулін і Сяржук Сыс (аднагрупнікі), Анатоль Казлоў (маладзейшы на год), Вольга Куртаніч і Ліля Плыгаўка. Словам, дастаткова актыўная паэтычная беларуская сябрына.

Менавіта там мы пачалі задумвацца над пытаннямі беларускай мовы, развіцця гісторыі, культуры. Увогуле, над лёсам Беларусі. Аналізаваць, што з гэтага будзе і ў якім мы становішчы знаходзімся. Мяне ўжо тады пачалі хваляваць пытанні нацыянальнай адметнасці, беларушчыны. Я яшчэ пасля дзясятага класа хацеў напісаць ліст у "Известия" ці якую іншую цэнтральную газету пра несправядлівае становішча з беларускай мовай, зрабіў чарнавік на 5 старонак, але не перапісаў і не даслаў. Мо і добра, а то б не бачыць бы тады мне ўніверсітэта, прыйшлося б ісці на "хімдым" да бацькі, гайкі круціць.

У 1981 годзе на грошы, заробленыя ў будаўнічым атрадзе, адправіўся ў вандроўку па гістарычных мясцінах Беларусі. Дзе на маршрутных аўтобусах, дзе аўтастопам, дзе пехам.

Уражанняў было шмат. Галоўнае — беларуская мова жыве! У адрозненне ад цяперашняга часу на ёй сапраўды размаўлялі ў вёсках і мястэчках, амаль паўсюль.

Падчас той вандроўкі мне пашанцавала пабываць у Мікалаеўшчыне, што, як вядома, была "родным кутом" Якуба Коласа. Якраз набліжалася 100-годдзе з дня нараджэння дзядзькі Якуба, таму там працавалі нейкія мастакі. Мабыць, такі быў дзяржаўны заказ. Самым актыўным з іх быў Мікола Купава. Мяне ўразіла іхняя беларуская мова. Гэта і стала прычынай знаёмства. Мікола спытаў: "Як цябе завуць?" Я адказаў: "Саша". А Купава сказаў: "Не, цябе завуць не Саша, а Алесь". Так што з 19 гадоў я стаў Алесем, размаўляю выключна па-беларуску і вырашыў, што ўсё з гэтым звязанае будзе для мяне галоўным на ўсё астатняе жыццё. Фактычна так яно і атрымліваецца.

Дарэчы, менавіта Купава пазнаёміў мяне з мінскімі актывістамі-студэнтамі (сярод іх былі Вінцук Вячорка, Сяржук Сокалаў), якія потым і складуць "касцяк" беларускіх адраджэнцаў хвалі 1990-х. Ужо ў іх я браў негатывы з рознымі забароненымі выданнямі 30-х гадоў, творамі Міколы Ермаловіча і вёз у Гомель, дзе раздрукоўваў і даваў чытаць іншым.

У 1984 годзе я скончыў універсітэт і некалькі месяцаў папрацаваў настаўнікам у Лельчыцкім раёне Гомельшчыны, а потым паступіў у аспірантуру Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР. Гэта быў самы пачатак новай хвалі нацыянальнага адраджэння і росквіт знакамітай творчай "Майстроўні". Праз яе прайшлі некалькі соцень чалавек, большая частка з якіх і зараз працуе на карысць беларушчыны.

Дарэчы, на гэты ж момант выпадае і першая акцыя пратэсту. "Наверсе" вырашылі разбурыць дом, дзе ў сярэдзіне XIX стагоддзя была пастаўлена першая беларуская п'еса Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, і актывісты "Майстроўні" наладзілі публічны супраціў. На акцыю з плакатамі выйшлі каля дзесяці чалавек (Вінцук Вячорка, Зміцер Саўка і іншыя) і вельмі хутка апынуліся ў міліцыі. Праз пэўны час усіх адпусцілі. Камуністычная ўлада зрабіла выгляд, што нічога неардынарнага не адбылося.

Праз паўгода мяне прызвалі ў Савецкую Армію, бо ніякіх адтэрміновак для аспірантаў тады не было. Служыў пад Свярдлоўскам механікам-вадзіцелем браніраванага цягача ў артылерыйскім знішчальным супрацьтанкавым батальёне.

Аднойчы адбыўся такі выпадак. У "акумулятарных" было вельмі цёпла, і салдаты там узімку адсыпаліся, калі была вольная хвіліна. У тым ліку і я. Адзін раз прачынаюся — няма побач майго земляка. Праз 10 і 20 хвілін — тое самае. А на вуліцы мінус 20. Устурбаваўся, выйшаў, каб паглядзець. Аказалася, тэхнічны парк, пакуль мы спалі, здалі пад ахову, і малады паставы з Арменіі ўвесь час трымаў яго "на мушцы аўтамата". Упрасіць адпусціць не ўдалося, прыйшлося вылазіць праз акно і бегчы да разваднога, добра што знаёмага сяржанта, каб аддаў загад адпусціць.

На жаль, армейская служба складалася не толькі з такіх "прыколаў" і давалася мне цяжка. Не фізічна — маральна. Думкамі я быў у Беларусі. З войска "выскачыў", як корак з пляшкі. Пасля салдацкай службы былі прадугледжаны яшчэ і двухмесячныя афіцэрскія курсы. Атрымліваць лейтэнанцкія "зорачкі" не стаў, зрабіў "дэмбельскі акорд", каб толькі не заставацца на лішнія месяцы ў войску, і вярнуўся вучыцца. Як кажуць, чыстыя пагоны — чыстае сумленне.

Супраць плыні

Калі з арміі я звольніўся ў запас, то ў беларускай сталіцы дулі ўжо новыя ветры. Было заснавана і актыўна працавала маладзёжнае аб'яднанне "Талака", ва ўніверсітэце і розных інстытутах з'явіліся шматлікія нефармальныя групоўкі. Вясной 1986 года адбыўся і першы разгон моладзі, якая ў Траецкім прадмесці спрабавала святкаваць "Гуканне вясны". Улады падбухторылі былых "афганцаў" пабіць "фашыстаў", якія на самай справе вучыліся ў мастацкай школе імя Івана Ахрэмчыка.

Грамадства ў той час было ў нейкім сэнсе наэлектрызавана, і ў мяне адразу з'явілася шмат новых вельмі цікавых знаёмых. Асоб сапраўды каларытных. Дастаткова нагадаць толькі аднаго — Алега Бембеля, у бацькоўскім доме якога неаднойчы праходзілі літаратурныя, паэтычныя, філасофскія сустрэчы, а зараз там музей.

Мы стварылі больш вузкае кола, у якое тады ўваходзілі Вінцук Вячорка, Сяргей Дубавец, Алесь Суша, Сяргей Воюш, я, Генадзь Сагановіч ды яшчэ некалькі асоб, дзейнічалі ў канспіратыўным стылі, збіраліся ў заводскай падсобцы на радыятарным, дзе тады грузчыкам працаваў Віктар Івашкевіч, які таксама быў нашым аднадумцам, у дзіцячым садочку, дзе па начах вартаваў нехта з маіх сяброў, распрацоўвалі планы дзейнасці і ставілі перад сабой цалкам палітычныя мэты. Нагадаю, што ішоў толькі 1986 год. Калі б пра ўсё даведаліся адпаведныя органы, для нас гэта не скончылася б дабром...

Зноў пашанцавала. Пачаўся час перабудовы, і магчымасці для працы з'явіліся значна большыя. Тое, за што на пачатку 80-х жорстка пераследавалі, у другой палове дзесяцігоддзя стала амаль законным. Зразумела, пры пэўных канспіратыўных момантах, бо сама сістэма заставалася такой, якой яна была раней.

Уся наша дзейнасць падзялілася на дзве часткі.

Першая — падпольная. Не больш за тузін аднадумцаў вырашаў стратэгічныя накірункі дзейнасці і найбольш эфектыўныя шляхі дасягнення нашай мэты. Друкаваліся яны ў часопісу "Бурачок", за распаўсюджванне якога міліцыянты ўпершыню арыштавалі брата Віктара Івашкевіча — Яўгена.

Другі момант — легальны. Гутарка пра работу так званых "нефармальных" арганізацый, якія аб'ядноўвалі моладзь па інтарэсах. Адну з іх мы прыдумалі і стварылі разам з Анатолем Сысам — таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя".

Сітуацыя сярод пішучай моладзі таксама была дастаткова крытычная. Творцы ўжо хацелі пісаць так, як хацелі, каноны сацыялістычнага рэалізму не толькі не спрацоўвалі, але ад іх ужо блажыла. Хацелася чагосьці іншага, больш праўдзівага.

Калі на першае наша пасяджэнне ў інтэрнаце Анатоля Сыса (вуліца Акадэмічная) сабралася дзевяць чалавек, то літаральна праз два месяцы на гэтыя сходы ўжо прыходзіла па некалькі дзясяткаў маладзёнаў. Сёння гэта "хрыбет" сучаснай беларускай літаратуры.

Такім чынам, маё жыццё як бы падзялілася на дзве паловы — літаратурныя даследаванні і грамадская дзейнасць, бо мяне абралі прэзідэнтам "Тутэйшых". І першае цалкам залежала ад другога. Адбываўся злом эпохі. Валіліся былыя аўтарытэты, друкаваліся неабгрунтавана забытыя пісьменнікі, людзі пачыналі размаўляць на забароненыя тэмы.

Словам, ускылыхванне грамадства было вельмі значным. І адпаведны водгук ператвараўся ў пэўны супраціў. На працягу некалькіх год ішло балансаванне паміж дазволеным і не. Урэшце людзі перасталі баяцца.

У 1987 годзе адбыўся сплаў па Дзвіне супраць пабудовы там гідраэлектрастанцыі, першыя "Дзяды", першы паход на Курапаты, які прайшоў адразу пасля друкавання "ЛіМам" артыкула Зянона Пазьняка, а таксама мітынг у абарону Верхняга горада.

Некаторыя памылкова лічаць, што першыя "Дзяды" прайшлі ў 1988 годзе, калі ў Мінску пачала міліцэйскай "чаромхай". На самай справе гэта не так. Яны былі праведзены на год раней каля помніка Янку Купалу. Па сутнасці, там адбыўся мітынг-рэквіем. Адпаведная заяўка была пададзена своечасова, аднак ніякай рэакцыі на яе не было, таму тыя 300 чалавек, што прыйшлі, не ведалі, чым усё скончыцца. Дзякуй Богу, хапуна не адбылося. Кіраўніцтва краіны банальна разгубілася, бо за 60 год савецкай улады ніякіх "непадкантрольных" мітынгаў не было.

І, вядома, "Дзяды" каля Маскоўскіх могілак, які праводзілі "Тутэйшыя" ды іншыя грамадскія аб'яднанні. Заяўку ў Мінгарвыканкам падавалі я і Анатоль Сыс. Да нас далучылася гарадское Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое тады ачольваў мастак Васіль Шаранговіч, але яны потым "адпалі", бо ўлады афіцыйна забаранілі правядзенне гэтага свята ў "сувязі з 60-годдзем камсамола", якое адзначалася менавіта тады.

Хаця ўлады неаднаразова прызывалі на яе не хадзіць, мы вырашылі правесці акцыю. Нават спрабавалі запалохаць. Гэта вызвала супрацьлеглую рэакцыю. На наша здзіўленне, на "Дзяды-88" прыйшлі тысячы людзей.

Улады рыхтаваліся да разгону і недапушчэння акцыі. Пазней у рукі мне трапіў дакумент з рэгламентацыяй, што яны збіраліся рабіць. Адна група нейтралізуе лідараў, другая захоплівае сродкі агучвання і г.д. Па гэтым сцэнарыі яны і дзейнічалі.

Мяне арыштавалі адразу. Трэба сказаць, што рэзананс ад гэтай акцыі для іх быў вельмі нечаканым. Грамадства абурылася, народ пачаў думаць над тым, што адбываецца вакол і што трэба рабіць. Улічваючы, што за месяц перад тым быў створаны арганізацыйны камітэт Беларускага народнага фронту, гэта дало новаму руху тысячы прыхільнікаў. Дэмакратычныя змены ў Беларусі пачалі адбывацца вельмі імкліва. Ніхто такога прадбачыць не мог. Юнацкая мара пра незалежнасць краіны стала рэальнасцю.

Дарэчы, у 1988 годзе я атрымаў першы ў сваім жыцці штраф — 200 савецкіх рублёў. Гэтыя грошы сабралі калегі па Інстытуце літаратуры АН. Мабыць, тады ўва мне і пачаў нараджацца будучы праваабаронца.

У фотастудыі (з Эдуардам Акуліным).

У арміі.

Новыя колеры

Аспірантуру я скончыў вясной 1989 года, але кандыдацкай дысертацыі не абараніў, бо пачаліся такія часы, што на абарону не хапіла часу. Яна датычылася публіцыстычнай беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя, вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, якія прарочылі змену сітуацыі і заклікалі народ да абуджэння. У нейкай ступені нашы часы супадалі, таму мне гэта было асабліва цікава. На базе дысертацыі ў 1991 годзе выпусціў кніжку "Літаратура і нацыя" і вырашыў, што гэтага дастаткова.

Браць на працу мяне не вельмі хацелі. Спрабаваў уладкавацца ў Магілёўскі або Віцебскі педінстытуты. Дарэмна. У Акадэмію мяне браць не хацелі таксама, бо за часы вучобы двойчы фармальна выганялі з аспірантуры за дзейнасць, пра якую казалася раней. Кожны раз "абыходзілася". Дырэктар Інстытута літаратуры Віктар Каваленка быў харошым чалавекам і заўсёды мяне бараніў. Афіцыйна яны сказалі партыйным уладам "о'кей", правялі сход інстытута, дзе віцэ-прэзідэнт акадэміі Іван Навуменка крычаў: "Як такое можа быць, што адзін аспірант двум акадэмікам і шасці дактарам у шапку нас...ў?!", прынялі адпаведную пастанову аб выключэнні. Аднак калі праз два дні я прыйшоў забіраць дакументы, Каваленка сказаў: "Вучыцеся, Алесь, вучыцеся!" Парадоксы тых часоў.

Нікуды мяне не хацелі браць, таму па размеркаванні заставаўся толькі Гомель, адкуль я і прыехаў. Але з'явілася магчымасць "зачапіцца" за Мінск, дакладней за Музей гісторыі беларускай літаратуры, які толькі-толькі пачынаў працаваць. Туды былі патрэбны новыя даследчыкі, і пры дапамозе свядомых дзяўчат, якія там працавалі, перш за ўсё "талакоўкі" Ірыны Марачкінай, мяне ўзялі.

Па Саюзе ішла "хваля" (з самага верху), калі выбіралі кіраўнікоў розных прадпрыемстваў і ўстаноў. Неўзабаве такі конкурс абвясцілі і ў суседнім Музеі Максіма Багдановіча.

Я працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам і вырашыў узяць у ім удзел.

Было чатыры кандыдаты, але ўсе галасы аддалі мне. Так вырашыў калектыў. Трэба адзначыць, што гэта выклікала ў Міністэрстве культуры, мякка кажучы, непаразуменне. Там добра ведалі маю біяграфію. Месяц зацвярджэння не было, а потым тагачасны міністр Яўген Вайтовіч махнуў рукой — прызначайце.

У прафесійным плане перада мной паўсталі новыя задачы, таму што музея (як звычайнай экспазіцыі) яшчэ не было. А быў будынак, складзеныя ў фондах экспанаты, экспазіцыйны план, цудоўныя дзяўчаты, сярод якіх асабліва хацеў бы адзначыць разумнічку Веру Мікуту і выдатнага мастака, творцу мастацкага вобраза музея Эдуарда Агуновіча. У 1991 годзе меркавалі шырока святкаваць 100-годдзе Максіма Багдановіча, і да гэтай даты планавалася адкрыццё музея ў Траецкім прадмесці.

Пачалася літаральна шалёная праца. Шмат у чым яна была звязана з мастакамі, экспазіцыйным бачаннем сітуацыі, чаго не было раней, экспанатамі, навуковай працай і плюс з "асаблівасцямі" тагачаснага Савецкага Саюза. У краіне панаваў татальны дэфіцыт. Даваліся грошы, за якія немагчыма было што-небудзь купіць, кантролю з боку Міністэрства культуры вялікага не было, але была вялізная ўнутраная адказнасць. Мы павінны былі зрабіць гэты музей у тэрмін. Дзякуй Богу, усё атрымалася. Праз пару гадоў пасля адкрыцця экспазіцыя музея атрымала Дзяржаўную прэмію Беларусі.

Цікавы момант. У 1990 годзе мяне абралі дэпутатам сталічнага гарсавета, і, калі ў 1991 годзе там разглядалася пытанне нацыянальнай сімволікі, я загадзя прынёс бел-чырвона-белы сцяг, які перад гэтым упрыгожваў фае музея. Пасля ўхвалы гарсаветам новай нацыянальнай сімволікі гэты сцяг праз некалькі хвілін залунаў над будынкам Мінгарвыканкама. Першы ў краіне. За два тыдні да таго, як ён стаў дзяржаўным.

Пакуль працаваў у музеі, за дырэктарства асабліва не трымаўся, разглядаў музей як нацыянальную пляцоўку, а не сховішча мёртвых рэчаў, таму там больш за год месцілася дубаўцоўская "Наша Ніва", тулілася нейкі час герменчукоўская "Свабода", праводзіліся сходы Управы і Сойму БНФ, адбывалася святкаванне ўніяцкіх калядаў, збіралася Беларуская каталіцкая грамада, былі зарэгістраваны дзясяткі няўрадавых арганізацый. Адным словам, музей быў напоўнены сучасным беларускім жыццём.

Дырэктарам прапрацаваў да 1998 года і звольніўся па асабістым жаданні. За час майго кіраўніцтва музей адкрыў яшчэ тры экспазіцыі ў розных будынках (адну нават у Яраслаўлі), праводзіў значную навуковую работу, у ім праходзілі шматлікія літаратурныя імпрэзы. Як мне падаецца, музей у тыя часы быў адным з лепшых у краіне.

Гуканне вясны

Калі вясной 1996 года стала канчаткова зразумела, куды павядуць краіну новыя ўлады і што новую хвалю нацыянальнага адраджэння чакаюць нялёгкія часы, мы вырашылі стварыць грамадскую праваабарончую арганізацыю, якую так і назвалі — "Вясна-96". Галоўная мэта — салідарная падтрымка першых палітычных зняволеных. А яшчэ дзеля таго, каб аказваць юрыдычную дапамогу ахвярам палітычных рэпрэсій, збіраць і распаўсюджваць праваабарончую інфармацыю, праводзіць адукацыйную праваабарончую работу.

Дапамога была рознай. У тым ліку і матэрыяльнай. "Першы блін" у гэтым сэнсе атрымаўся даволі незвычайным. Адзін з дабрачынцаў прывёз паўтоны ўсялякай ежы — макарону, цукар, розныя крупы і г.д. "Сарціроўкай" па пакетах, якія затым раздаваліся пацярпелым, займаліся ўсе нашы валанцёры.

Два першыя гады я працаваў у "Вясне" паралельна з працай у музеі. А потым адтуль вымушаны быў сысці, мае літаратуразнаўчая і музейніцкая біяграфіі цалкам ператварыліся ў праваабарончую.

Шчыра кажучы, калі стваралі гэтую арганізацыю, я не думаў, што яна праіснуе так доўга. Лічыў, праз 2—3 гады (максімум 5) патрэба ў ёй увогуле адпадзе, і мы вернемся да звычайнай работы — музейнай, літаратурнай, навуковай, палітычнай. На жаль, памыліўся.

Сярод таго, чым зараз мы займаемся, асабліва хачу выдзеліць назіранне за выбарамі — вось без чаго немагчымыя якія-небудзь змены па вызначэнні. У нашай сітуацыі гэта надзвычай важна — зразумець, чаму тыя людзі, якія прыйшлі ў 1994 годзе, так доўга застаюцца пры ўладзе. Калі б у нашай краіне ўсё адбылося празрыста і дэмакратычна, улада памянялася б і не адзін раз.

Партнёрамі "Вясны" сёння з'яўляецца больш за тузін міжнародных і замежных арганізацый, а сам праваабарончы цэнтр прыняты сябрам у дзве міжнародныя структуры. У тым ліку і ў вядомую Міжнародную федэрацыю правоў чалавека (FIDH) са штаб-кватэрай у Парыжы, якая аб'ядноўвае больш за 170 праваабарончых арганізацый з усяго свету. На кангрэсе ў Лісабоне ў 2007 годзе мяне абралі віцэ-прэзідэнтам FIDH.

Двойчы нарвежскія парламентарыі вылучалі на атрыманне Нобелеўскай прэміі міру. І галоўнае ў гэтым была не асоба. Мэта іншая — прыцягнуць увагу міжнароднай супольнасці да сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

А рацыя, на жаль, такая ёсць. Не буду пералічваць усё, што адбываецца падчас так званай "лібералізацыі па-беларуску". Адзначу толькі: у "Вясну" штогод па розных прычынах звяртаецца па дапамогу некалькі тысяч беларусаў. А гэта гаворыць пра многае.

У 1998 годзе праваабарончы цэнтр "Вясна-96" быў зарэгістраваны, праз два гады, са з'яўленнем філіялаў, стаў арганізацыяй рэспубліканскага маштабу. Сёння сябрамі гэтай структуры з'яўляюцца некалькі соцень валанцёраў. У 2003 годзе рэгістрацыю ўлады скасавалі і не аднавілі па гэты дзень. Ні пад старой, ні пад новай ("Наша вясна") назвай.

Фактычна мы вярнуліся да таго, з чаго я пачынаў у сваёй маладосці, але ўжо на іншым узроўні, з мільёнамі прыхільнікаў дэмакратыі і правоў чалавека ў краіне. Наперадзе яшчэ вялікая праца, і, як і раней, жніва шмат, а сейбітаў мала.

Аляксандр ТАМКОВІЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16 ЖНІЎНЯ 2011 г.

Ніл ГІЛЕВІЧ

Тры старонкі з аўтабіяграфіі

Самая праўдзівая аўтабіяграфія паэта — у яго вершах. Ісціна не новая, але ведаюць гэта далёка не ўсе.

Н.Г.

Усё жыццё

Усё жыццё к братэрству зваў —
З мальбой удзень, з плачом уночы, —
І толькі сэрца надарваў,
І толькі сплакаліся вочы.

А хоць бы хто, а хоць бы дзе
Азваўся словам забалелым —
У незлічонай грамадзе,
У неаглядным свеце белым.

Куды ж яшчэ з маёй журбой,
З маёй бядой пайсці на споведзь,
Каб расказаць, як крыўда-боль
Ізноў душу мне есць упоедзь?

У цёмны лес пайду і там
Апошні раз нагаваруся.
Скажу ўсё дрэвам і кустам,
Хто ёсць я ў роднай Беларусі.

Скажу: "О, дрэвы і кусты,
Яшчэ з гадоў маленства мне вы
Былі як сёстры і браты, —
Маёй зямлі кусты і дрэвы.

Пачуйце ж голас-кліч бяды —
Пакуль хаджу, пакуль жывы я.
Пачуйце! Нават і тады,
Калі душа ваўком завые".

1999, красавік

Праклён

Будзьце праклятыя вы, каты свабоды!
Вы, што душылі і душыце нас!
Вы, акупатары нашай гасподы,
Нашых багаццяў і нашых украс!

Будзьце праклятыя і вы, запраданцы,
Лёсам народу майго гандляры!
Юдавы вылюдкі і ўзгадаванцы!
Брудных і блудных таргоў махляры!

Будзьце праклятыя і вы, вырачэнцы
Мовы і духу бацькоўскай зямлі!
Вы, надзіманыя пыхай нікчэмцы,
Волі і хэнці чужой халуі!

Гэта з крыжа я крычу вам, распяты
Горам народа і болем маім.
Будзьце праклятыя вы! Будзьце праклятыя!
Сёння і заўтра й вавекі! Амін!

2002

Чым больш я на свеце...

Чым больш я на свеце і жыў і мадзеў —
ішачыў, цярпеў і змагаўся, —
тым болей да праўды дабрацца хацеў,
да праўды ўсім духам ірваўся.

З хлусні і з абману, з аблуды сляпой —
да праўды, да праўды штосілы!
да самай вялікай, галоўнай, да той,
што кожнага лучыць з усімі.

І вось яна ўрэшце адкрылася мне —
ні чым не прыкрытай паўстала.
У поўнай істоце. Ва ўсёй галізне.
...І праўда мяне зруйнавала.

Студзень 2007 г.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Хто выбіў з рук беларусаў зброю для абароны нацыянальных інтарэсаў?

Навуковымі даследаваннямі ўстаноўлена, што мова і свядомасць непарыўна ўзаемазвязаны. Свядомасць матэрыялізуецца праз мову. Толькі выяўленая ў мове калектыўная свядомасць становіцца сацыяльнай рэальнасцю. Гэта значыць, што з умацаваннем і развіццём беларускай мовы будзе мацнець і развівацца нацыянальнае пачуццё беларусаў. Ці не таму вынішчэнне ў нашай краіне роднай для большасці насельніцтва мовы стала адной з галоўных мэт антыбеларускага рэжыму з першага дня яго існавання.

Многія яшчэ не ўсвядомілі даўно вядомую ісціну: **губляючы родную мову, чалавек разам з ёю губляе ўсё лепшае, што яму назапасілі продкі — гісторыю, культуру, духоўнасць, інтэлект, свабоду. А з імі — і сваю маёмасць, дабрабыт. Так, так, даражэнькія, і маёмасць, і дабрабыт, якія, на жаль, сталі галоўным прыярытэтам у сучасным нашым грамадстве.** Гэта яскрава пацвердзілі падзеі ў краіне за апошнія 7—8 месяцаў, калі большасць беларусаў з жахам заўважыла, што раптоўна згубіла значную частку свайго дабрабыту разам з грамадзянскімі і да таго ўрэзанымі свабодамі і правамі.

У тармажэнні развіцця беларускай нацыі, у дамінантнай інфармацыйнай прысутнасці ў Беларусі, у панаванні тут расійскай мовы ды ў іншых падобных рэчах стратэгічна зацікаўлена суседняя Расія. Такі падыход застаецца нязменным ужо шмат гадоў.

Яшчэ на пачатку пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя ў нашай краіне школы ў сваёй большасці былі беларускімі, усе прадметы выкладаліся там па-беларуску. Мне пашчасціла вучыцца ў такой школе. Тады галоўныя падручнікі мелі прыгожыя і дакладныя назвы: **"Родная мова" і "Родная літаратура"**. Менавіта так — **родныя**, бо іншымі для беларусаў яны і не маглі быць. Цяпер гэтыя падручнікі называюцца так, як і іншыя, у тым ліку замежныя, — "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура". Мусіць, таму, што для тых, хто змяняў назву падручнікаў, беларуская мова не была роднай.

Між тым навукова абгрунтавана, што беларускія дзеці, якія навучаюцца на беларускай мове, лепш засвойваюць вучэбны матэрыял, маюць больш грунтоўныя веды па ўсіх прадметах, чым такія ж беларускія дзеці, якія навучаюцца на рускай мове. Гэта было пераканаўча пацверджана ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі па ўсёй краіне яшчэ дзейнічалі беларускія школы і дзіцячыя садочкі. Тады ўсе — так, усе выпускнікі Беларускага нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа, дзе навучанне праводзілася выключна па-беларуску, без праблем паступалі ў любыя ВНУ, дзе быў вельмі высокі конкурс, на розныя спецыяльнасці. Гэта праўдзівы факт, і, падобна, гэта і ёсць галоўная прычына ліквідацыі ліцэя ўладамі.

Асабліва вялікую шкоду прынёс ганебны рэферэндум 1995 года, які — ужо ў незалежнай краіне — даў старт працэсам вынішчэння беларускай мовы і разбурэння сістэмы беларускай адукацыі. Галоўнай мэтай таго рэферэндуму была ліквідацыя статусу беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай і фактычнае наданне ёй, калі называць рэчы сваімі імёнамі, статусу маргінальнай.

Паспрабуйце ўявіць сённяшнюю сітуацыю ў Беларусі, калі б не было таго ганебнага рэферэндуму. У якім стане былі б тады беларуская мова, беларуская адукацыя, беларуская культура і беларуская эканоміка? Які быў бы склад беларускага парламента, беларускага ўрада, беларускіх судоў? Ці былі б сёння пры ўладзе непрыхільныя да ўсяго беларускага служачыя дзяржаўнага апарата? Як бы за гэтыя 16 гадоў расквітнела наша краіна, калісьці адна з самых культурна і эканамічна развітых рэспублік былога СССР! Зараз жа ў Беларусі на самым высокім дзяржаўным узроўні адкрыта дэманструецца непавага да мовы тытульнай нацыі. Ніхто з высокіх дзяржаўных асоб (за выключэннем хіба што цяперашняга міністра культуры Паўла Латушкі) публічна не ўжывае родную мову. Такога няма больш нідзе ў свеце.

Ці не таму ў нашай краіне сёння няма ніводнага цалкам беларускамоўнага дзіцячага садочка, ніводнай цалкам беларускамоўнай школы і ніводнай беларускамоўнай ВНУ? Ніводнае дзяржаўнае прадпрыемства, ніводная дзяржаўная ўстанова не вядуць справаводства на беларускай мове, а толькі — на мове суседняй дзяржавы. І гэта — узаконенае дзвюхмоўе?

Дзе яно? Такое адбываецца ў краіне, дзе большасць насельніцтва — беларусы.

Вынікі антыбеларускасці кіруючага рэжыму відавочныя. Вось яна.

1. Дэмаграфічная сітуацыя ў краіне характарызуецца працэсам дэпапуляцыі. Штогадовая колькасць памерлых перавышае колькасць народжаных. За 17 гадоў насельніцтва нашай краіны зменшала больш як на 600 тысяч чалавек! Замест таго, каб стварыць спрыяльныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі, рэжым, верагодна, разлічвае прыцягнуць у Беларусь перасяленцаў з іншых краін (найбольш верагодна з Расіі) з выплатай ім пад'ёмных у памеры 1000 долараў на кожнага. Відавочна, што прыстойны чалавек і дбайны гаспадар за такія грошы не рызыкне адрывацца ад сваіх каранёў. На такое можа паквапіцца бадай што лайдак. Такім чынам можа адбыцца замена выміраючага беларускага насельніцтва люмпен-пралетарыятам з суседніх краін. Хіба гэта не абсурд?

2.Лічу: свядома створаны спрыяльныя ўмовы для алкагалізацыі насельніцтва. У выніку, паводле ацэнкі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожны беларус у пераліку на чысты спірт у 2010 годзе спажыў 15,13 літра алкаголю. Гэта выводзіць нашу краіну ў дзясятак найгоршых па гэтым паказчыку ў свеце. Так можна ў хуткім часе дагнаць Расію, дзе ў год на аднаго чалавека спажываецца 18 літраў чыстага алкаголю. А паводле дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, толькі 8 літраў чыстага алкаголю на душу насельніцтва ёсць мяжа, за якой пачынаецца дэградацыя асобы і нацыі. Такім чынам, кіруючы рэжым ужо перацягнуў беларускую нацыю за гэту небяспечную мяжу.

3. Катастрафічна падае маральны ўзровень грамадства, асабліва сярод моладзі.

4. Мэтанакіравана разбураецца сістэма беларускай адукацыі. Так, у мінулым годзе пры правядзенні ў ВНУ дзяржаўнага тэсціравання высветліўся вельмі нізкі ўзровень ведаў выпускнікоў школ па ўсіх прадметах. На бюджэтную форму навучання вымушаны былі залічваць абітурыентаў, агульны бал якіх па профільных прадметах не перавышаў 25 балаў з магчымых 100! Гэта значыць, што месцы ў нашых ВНУ пачалі займаць двоечнікі і троечнікі. Сёлета сітуацыя стала яшчэ горшай. Раней жа заўсёды ў беларускіх ВНУ былі вялікія конкурсы. Каб стаць студэнтам, трэба было ўступныя экзамены здаць не ніжэй як на "добра" і "выдатна". А зараз?

5. Разбураецца беларуская эканоміка. Зніжаецца канкурэнтаздольнасць найбольш важных відаў прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У выніку расце адмоўнае сальда знешнегандлёвага балансу — аднаго з важнейшых макраэканамічных паказчыкаў. Вось адна з галоўных прычын сённяшняга валютна-фінансавага крызісу.

6. Каб не дапусціць поўнага краху эканомікі і часова прадухіліць спеючы ў грамадстве сацыяльна-эканамічны выбух, рэжым набірае замежныя крэдыты, якія вяртаць павінны будуць нашы дзеці і ўнукі. Знешні доўг краіны ўжо перавысіў 30 млрд долараў ЗША (больш як па 3000 долараў на кожнага беларуса).

7. Каб працягнуць далей сваё існаванне, рэжым гандлюе нацыянальнай маёмасцю, набытай многімі папярэднімі пакаленнямі беларусаў.

8. Расійскі капітал апанаваў амаль усе камандныя вяршыні ў беларускай эканоміцы. Унутраны гандаль манапалізуецца праз супермаркеты, якія ствараюцца і кантралююцца небеларусамі. Беларускае ж прадпрымальніцтва паслядоўна і мэтанакіравана разбураецца. Пад выглядам "навядзення парадку" ліквідавана большасць кропак дробнага рознічнага гандлю, не развіваецца сярэдні бізнес.

9. Забаронены спрадвечныя нацыянальныя дзяржаўныя сімвалы — герб "Пагоня" і святы бел-чырвона-белы сцяг, а іх прыхільнікі жорстка пераследуюцца.

10. Сённяшняя Беларусь — сусветны і еўрапейскі лідар па колькасці асуджаных і па колькасці міліцыянераў на 100 тысяч насельніцтва, а таксама лідар па самазабойствах.

Галоўнай прычынай гэтых і іншых праблем нашага грамадства з'яўляецца антынацыянальная сутнасць дзеючай улады.

Беларуская мова — найбольш эфектыўная зброя ў абароне чалавечай годнасці і нацыянальных інтарэсаў беларусаў.

Варта толькі ўсім, хто ведае родную мову, пачаць ёю карыстацца — дома, на працы, у транспарце ды іншых грамадскіх месцах, як станоўчы вынік не трэба будзе доўга чакаць. Не верыце? А паспрабуйце. Нашы людзі тады адчуюць паміж сабой духоўную роднасць, агульнасць інтарэсаў у асабістай адказнасці за лёс Радзімы. Іх свядомасць будзе мацнець, а салідарнасць паміж імі стане жыватворнай крыніцай для годнага жыцця. Мы можам яго наблізіць самі — "усяго толькі" любоўю да роднай, спракаветнай мовы нашых продкаў.

Мікалай КРЫЖАНОЎСКІ,
дэпутат
Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь
12-га склікання.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Сіла ёсць — не трэба розум

У Акадэмію МУС такі нізкі прахадны бал, што туды могуць паступіць абітурыенты, якія ў школе былі сераднячкамі...

Не лічыўся Ціт дэбілам,
Не хапаў і з неба зор.
Маці часта рэмнем біла
І выказвала дакор:
— Ну калі за розум, невук,
Будзеш брацца? Во гультай!
Годзе пазіраць на дзевак,
Лепей кніжку пачытай!
Ну чаму такі кароткі
У цябе, абэлтус, клёк?
Вунь твае ўсе аднагодкі
У сталіцу мецяць крок.
А яны ж у інстытуты
Там паступяць без пакут.
Ты ж сядзецьмеш, як прыкуты,
"Інстытут" твой будзе тут.
Раздражняла гэта Ціта:
— Не плявузгай ты брыду!
Будзе, маці, шыта-крыта,
Я ў міліцыю пайду...
Потым Ціт пакінуў вёску,
Захлынуў жыццёвы вір.
Паслужыўшы трохі ў войску,
Зноўку апрануў мундзір.
А на ім — сяржанта лычкі,
Ціт жа — міліцыянер.
І памкненні ўжо, і звычкі
Мае іншыя цяпер.
Ён ахоўвае "сістэму"
І пануючы рэжым,
Бо ў апошні час нацдэмы
Абнахабелі зусім
І бадзяюцца па плошчы...
З сябрукамі разам Ціт
Іх дубінкай плённа хвошча,
А для абароны — шчыт.
Калі ў ладкі маладзёны
Сталі пляскаць без прычын,
Паляваў на іх штодзённа,
Без мундзіра ўжо прычым.
Ціт вакол вачыма тыцкаў
І шукаў сабе ахвяр.
Дзевак Ціт хапаў за цыцкі,
А хлапцам жа біў у твар.
Кідаў іх у аўтазакі,
Як жывёлу, і тады
Атрымоўваў Ціт падзякі,
Крочыў сведкаю ў суды.
Кіраўніцтвам жа ягоны
Быў заўважаны парыў.
— Час і зоркі на пагоны, —
Капітан загаварыў. —
Дыспазіцыя такая:
Быў ты стойкі ў барацьбе,
Акадэмія чакае
Міліцэйская цябе.
І хаця замала балаў
Меў у атэстаце Ціт,
Акадэмія прыдбала
Дзецюка за знешні від.
Бы ў штангіста, мае плечы,
Шыя як у бугая
(За выкладчыкаў, дарэчы,
Ціт вышэйшы удвая).
Будаўнічыя цагліны
Разбівае ён аб лоб.
Што ж, такі асілак слынны
Акадэміі ўспадоб.
Не бяда, што ў інтэгралах
Ціт амаль дэгенерат.
Пры разгонах і аўралах
Не патрэбна ведаў шмат.
І дарма, што на дыктантах
Ён заўсёды мае кол.
"Дабрэ" на дэманстрантах,
Як пісацьме пратакол.
Будзе ў хлопца лёс удалым,
Ціт — міліцыі аплот.
І, напэўна, генералам
Стане ён праз дваццаць год.

* * *

Што ж, няхай амаль дэбілы
Паступаюць без чаргі.
Людзі кажуць: многа сілы —
Дык не трэба мець мазгі...

Эдик Базанов ждет вашей помощи

Два с половиной года назад в семью Базановых пришла беда.
В семье родился больной ребенок. С первой секунды жизни он был обречен на борьбу: вначале кома и ИВЛ, а затем тяжелый диагноз — детский церебральный паралич тяжелой формы, эпилепсия.

"В свои 2,5 года наш сын не передвигается, не владеет руками, не говорит, — написали в "Народную Волю" родители мальчика. — *Врачи-неврологи Беларуси и России лишь разводят руками, а реабилитационные центры не принимают нашего сына из-за наличия судорог в анамнезе. Оказавшись один на один с нашей бедой, мы нашли Институт развития человеческого потенциала, основанный Гленном Доманом в Филадельфии, где не отказываются даже от самых тяжелых детей и ежедневным упорным трудом родителей восстанавливают мозг и помогают детям догнать своих сверстников. Мы добились того, что Институт принял нашего сына на интенсивную программу лечения. Ребенку назначается программа, по которой родители занимаются с ним ежедневно, 24 часа в сутки, и ставятся конкретные цели по развитию, которых нужно достигнуть к следующему приезду. Программа предполагает приезд в США раз в полгода на обследование и корректировку занятий. Первую поездку нам удалось оплатить за собственные средства и кредит. Дальнейшее лечение нашего сына возможно только при благотворительной помощи добрых людей.*

Результаты занятий по данной методике у Эдуарда просто потрясающие. После первой поездки у ребенка наладилось пищеварение, он перестал сутками плакать и появилась первая улыбка, а после второй — уровень развития ребенка вырос с 4 до 8 месяцев, особенно потрясло зрение: ребенок, которому в один месяц ставили диагноз "слепота", четко продемонстрировал, что он способен видеть даже мелкие детали, то есть его зрение практически соответствует возрасту. А 8 июня 2011 года мы вернулись уже с 3-го курса лечения. На этот раз результаты еще сильнее нас потрясли — у ребенка прекратились судороги, с которыми не могли справиться лучшие неврологи Беларуси и России, а еще — он научился читать, что и для здорового ребенка двух с половиной лет является редкостью. Для нас это огромные результаты, и мы просто не можем остановиться и должны дальше бороться за своего Эдика. Впереди у нас долгий путь, пока ребенок не станет здоровым и способным вести полноценную жизнь.

Очередная поездка запланирована на 14 ноября 2011 года. К сожалению, о финансовой стороне мы вынуждены думать уже сейчас — в сложившейся в стране экономической ситуации нам нужно успеть не только собрать деньги, но и получить разрешение Нацбанка на приобретение валюты. Стоимость каждой поездки — около 11.000 долларов США (4700 — стоимость лечения, 3300 — авиабилеты, 1500 — проезд и проживание в США, 1000 — закупка медикаментов и спецоборудования, 400 — визы)".

Для семьи Базановых это неподъемная сумма, так как работает только отец Эдика. Программа лечения предполагает, что мать постоянно, с утра до вечера, занимается с ребенком. Родители мальчика надеются на вашу помощь. Все, кого не оставила равнодушными судьба маленького Эдуарда, могут ему помочь, перечислив средства на благотворительный счет, открытый в филиале №514 АСБ "Беларусбанк", УНП 100420097; МФО 153001614. Назначение платежа: "На Дубинко Ольгу Вячеславовну для лечения сына Базанова Эдуарда".

В белорусских рублях — №000000008 (Транзитный счет №3819382102369 при перечислении средств юрлицом).

В долларах США — №8400000000112 (Транзитный счет №3819382109779 при перечислении средств юрлицом).

В евро — №9780000000018 (Транзитный счет №3819382109779 при перечислении средств юрлицом).

В российских рублях — №6430000000009 (Транзитный счет №3819382109779 при перечислении средств юрлицом).

Номер кошелька EasyPay: 09814460.

Номера кошельков Webmoney:
бел.рубли: B131285312953,
доллары США: Z310650633740,
российские рубли: R249762746578,
евро: E149232757799.

Для почтовых переводов:
Получатель: Дубинко Ольга Вячеславовна
Паспорт МР 2051911 выдан Советским РУВД г.Минска
Адрес: 220017 г. Минск, ул. Кунцевщина, 15-15.

ЗАЧАПІЛА...

Шаноўны Дзяніс Рабянок!
Шаноўная "Народная Воля"!
Прачытаў трапяткую нататку "Што гэта за "Нацыянальны сход", калі яго члены цураюцца беларускай мовы і ігнаруюць яе?" і цалкам пагаджаюся з вамі. Мне даўно карцела сказаць усё тое, што сказаў беларускаму чынавенству спадар Дзяніс Рабянок. У свой час у маёй беларускай галоўцы саспеў абразок. Мяркую, ён сугучны са згаданым у газеце.

Без Ф.Б. у галаве

Пра аднаго беларускага чыноўніка досыць высокага рангу, які ігнараваў і працягвае ігнараваць усё беларускае, казалі:

— А што з яго возьмеш? Ён жа без Ф.Б. у галаве!

— Без чаго, без чаго?

— Не без чаго, а без каго... Без Ф.Б. — Францішка Багушэвіча... Без нашага Мацея Бурачка. Мне так падаецца: хто не носіць у сэрцы і душы ягоны заклік "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!", ад таго можна чакаць чаго хочаш і чаго не хочаш!..

Мова — гэта ж не толькі сродак зносін. Мова — гэта і наш менталітэт, самасвядомасць, нацыянальны гонар і годнасць. Якая мова — такі і менталітэт народа.

...Шмат у нас гаворыцца пра незалежнасць. Але пры такім стаўленні да нашай мовы і культуры, якое зараз існуе ў чынавенства і "Нацыянальнага сходу" (трэба ж, ён, не карыстаючыся мовай тытульнай нацыі, зацвярджаў змены ў яе правапісе!), навошта яны нам, беларусам? Хіба дзеля чыноўніцкіх пасад і добрых акладаў?!

Уладзімір
СОДАЛЬ-САДЭЛЬСКІ,
пісьменнік.

ПОЧЕМУ?

Игра в одни ворота

Она длится долгое время и продолжается этим летом, когда идут споры при обсуждении проекта закона "Об обращении с животными". Но силы сторон, к сожалению, неравны: против армии чиновников "сражаются" два-три активиста из общественных организаций, стремящихся, чтобы будущий закон получился хотя бы мало-мальски гуманным. Но их в упор не слышат, и положения закона, даже на стадии проекта, весьма отдалены от реальной жизни.

Не стану перечислять все "нестыковочные" моменты — их достаточно много. Но хочу понять: почему нет реального (а не декоративного, как сейчас) обсуждения будущего закона с широкой общественностью? Почему об этом нет информации в наших СМИ, почему в тени имена тех, кто, скрываясь за ширмой неизвестности, "не замечает" почти все предложения, идущие от здравого смысла?

16 августа в мире отмечается День бездомных животных. У нас, возможно, этот день тоже "отметят" — усиленным отловом брошенных хозяевами братьев наших меньших. Тем более что предполагаемый проект ущемляет права граждан и мало соответствует гуманному обращению с животными. Если он будет принят без предлагаемых изменений, это создаст условия для роста бездомной популяции собак и кошек — то есть приведет к эффекту, прямо противоположному ожидаемому. И никакие жесткие меры, в том числе увеличение штрафов, проблему не решат.

Для контроля в сфере защиты животных общественным объединениям в законопроекте предусмотрено очень "весомое" право — "запрашивать и получать информацию" от официальных органов. Богатый опыт общения с чиновниками показывает: ничего, кроме малозначащих отписок, нас и впредь не ждет. А групповая анонимность авторов нередко абсурдных нововведений уводит их от ответственности за внесенные предложения и даже от диалога с общественностью на стадии обсуждения проекта закона. Проекта, который не повернут ни к людям, ни к несчастным животным.

Розалия РУБИНЧИК,
зоозащитник.

Минск.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16 ЖНІЎНЯ 2011 г.

КОРОТКО

Ливийские повстанцы подбираются к Каддафи

Няпроста зараз жывецца людзям. У краіне эканамічны крызіс, долараў не знайсці, за мясам чэргі, кефір знікае ды яшчэ і выбухі на сонцы. Але знаходзяцца дзівакі, якія ў небяспечную пару вырашаюць стварыць новую сям'ю. Як у крызіс зрабіць вяселле яркім і эканомным? "Народная Воля" дае парады жаніхам і нявестам.

«Накатаць» заяву

Першы "шлюбны" крок, які вымушаны рабіць усе грамадзяне Беларусі, — падаць заяву ў загс. Можна распісацца ў загсе па месцы жыхарства аднаго з маладых ці запісацца ў Дом шлюбаў. Схема падачы заявы даволі простая. Спачатку запаўняеце анкету. Нараўне са звычайнымі пытаннямі аб узросце і месцы прапіскі трэба адказаць, дзе і на якой пасадзе працуеце, колькі гадоў жывяце па сваім адрасе.

Пасля запаўнення анкеты можаце выбіраць дату і час, калі цётачка са стужкай праз плячо папросіць вас распісацца ў гросбуху і павіншуе са стварэннем сям'і. Для тых, хто не любіць залішніх трат, падыдзе варыянт з неўрачыстай цырымоніяй. У будны дзень вас распішуць у маленькім пакойчыку, і ўсё. Калі гэта ваш варыянт, то далей дадзены тэкст можаце не чытаць. Дарэчы, за любую цырымонію прыйдзецца заплаціць — каля 30 тысяч афіцыйнага падатку і 50 тысяч за ўрачыстую цырымонію з мінімальнай "камплектацыяй".

Ва ўсіх загсах вісяць папярэджанні аб тым, што за распіццё на вуліцы вас чакае штраф. Дбайны міліцыянт дзяжурыць пры ўваходзе ва ўстанову і пільна сочыць за жадаючымі "абмыць" вяселле. Для тых, хто не дацерпіць да банкета, супрацоўнікі загсаў прапаноўваюць наведаць "залу шампанскага". За элегантнай назвай хаваецца звычайны пакой, дзе вы разам з гасцямі зможаце спакойна піць шампанскае і частавацца цукеркамі. Каштуе гэтая ідылія каля 50 тысяч. Затое ніякія штрафы вам не пагражаюць. Дарэчы, цукеркі будзеце набываць самі.

Даплаціць прыйдзецца і за змену праграмы цырымоніі. Цікава, але нават калі вы папросіце не ўключаць марш Мендэльсона, гэта будзе лічыцца зменай праграмы. Даплата — каля 120 тысяч. Добра, што хоць змяніць мову цырымоніі з рускай на беларускую можна бясплатна.

Налівай, бо не ядуць!

Роспіс у загсе — фінальная стадыя афіцыйнай часткі вяселля, пасля якой застаецца толькі добра пагуляць на банкеце. Але як падрыхтаваць вясельнае застолле без рызыкі для кішэні?

Нягледзячы на тое, дзе маладыя вырашылі святкаваць вяселле — дома, у рэстаране ці сталовай, выбар меню — сур'ёзная рэч. Сярэднестатыстычныя кавярні і рэстараны сталіцы банкетнае меню прапануюць з разліку па 180—220 тысяч на чалавека. Танней у сталоўках — ад 80 тысяч. Многія маладыя людзі ў апошні час з вялікім задавальненнем святкуюць вяселлі ў райцэнтрах — там меню ў рэстаранах значна танней.

Перад тым як заказваць пачастунак, трэба правільна разлічыць порцыі. Закон "адзін чалавек - адна страва" не працуе на вяселлях. Колькасць порцый (асарці, салаты) разлічваецца з вагі адной стравы па меню. Напрыклад, порцыю ў 100 грамаў у банкетным варыянце можна браць на дваіх, 150 грамаў — на траіх. Гэта не значыць, што вашы госці будуць сядзець галодныя. Наадварот, у людзей будзе магчымасць пакаштаваць розныя стравы, захаваць тонус для танцаў і месца для вясельнага торта. Бываюць і парцыённыя гарачыя закускі, напрыклад, жульен. Іх заказваюць, зыходзячы з колькасці гасцей. Найлепш арганізаваць падачу страў у некалькі змен — чым больш страў, тым весялейшае застолле. На гарачае лепш заказваць птушку ці рыбу. Цудоўны выхад — шматпарцыённыя стравы. Гэта самы зручны, эканомны і прыгожы варыянт.

Гасцей, якія збіраюцца да прыезду маладых, прынята частаваць аперытывам (на чалавека — 1—2 келіхі віна, шампанскага ці чаго-небудзь мацнейшага). Астатнія напоі найчасцей выстаўляюцца на стол, а разліваюць іх афіцыянты.

З разліку на 10 чалавек можна ўзяць наступную колькасць алкаголю: 3—4 бутэлькі моцных напояў (гарэлка, каньяк), 2—3 бутэлькі шампанскага, 3—4 бутэлькі віна. Гэта прыблізныя лічбы, якія можна скарэктаваць зыходзячы са спісу запрошаных.

Завяршае банкет вясельны торт, які заказваюць "на вагу" з разліку 1,5—2 кіло на 10 чалавек. Прыкладныя кошты такога смачнага фіналу — 36—70 тысяч за кілаграм у залежнасці ад інгрэдыентаў і афармлення.

Такім чынам, каб накрыць сталы для 40 гасцей у мінскай кавярні, спатрэбіцца ад 6 да 20 мільёнаў рублёў у залежнасці ад меню і напояў.

Шлюбная сукенка — бессэнсоўная і бязлітасная

Калі на банкеце ў вас і атрымаецца зэканоміць якую-ніякую капейчыну, напрыклад, дамовіўшыся з рэстаранам на "свой" алкаголь, то ад выдаткаў на святочныя строі вас нішто не выратуе. Калі 20 гадоў таму нявеста магла сама змайстраваць сабе шлюбную сукенку, сёння гэты варыянт дапушчальны толькі ў выпадку выбітных швейных здольнасцяў маладой. Кожная дзяўчына марыць аб "той самай сукенцы". Культ вясельных сукенак прыйшоў да нас з-за акіяна. Ужо шмат пакаленняў амерыканак пачынаюць збіраць грошы са школьнай лаўкі, каб выдаткаваць на сукенку сваёй мары некалькі тысяч долараў. На заакіянскім тэлебачанні нават здымаюць тэлеперадачы, прысвечаныя выбару нявестай сукенкі.

У Беларусі дзяўчыны найчасцей бяруць вясельныя сукенкі напракат. Набываць дорага — не менш за некалькі сотняў долараў, якія яшчэ і знайсці трэба. У салоне прыкладны кошт сукенкі вагаецца ад 700 тысяч да некалькіх мільёнаў. Няновы шлюбны строй з рук можна набыць за 350—400 тысяч. Пашыць сукенку яшчэ даражэй. Тканіна і праца абыдуцца прыкладна ў мільён. Дадайце кошты за вэлюм (ад 120 тысяч), пальчаткі (ад 50 тысяч), упрыгажэнні для валасоў (ад 60 тысяч), біжутэрыя (ад 100 тысяч за камплект), бялізна (ад 200 тысяч), панчошкі (ад 25 тысяч), туфлі (ад 200 тысяч). Візажыст падкарэктуе вобраз нявесты прыкладна за 25 долараў, а за самыя сціплыя манікюр і педыкюр ёй прыйдзецца аддаць каля 90 тысяч. Толькі на нявесту прыйдзецца аддаць каля двух з паловай мільёнаў, дый то калі пашанцуе знайсці некаторыя элементы вобразу па дакрызісных коштах.

Строй жаніха не нашмат танейшы. Прыстойны касцюм, які можна будзе яшчэ хаця б адзін раз апрануць на ўрачыстыя падзеі, — ад мільёна рублёў, туфлі — каля 500 тысяч, кашуля — ад 140 тысяч, класічны гальштук ці бабачка — каля 150 тысяч, бялізна — прыкладна 40 тысяч, шкарпэткі — ад 6 тысяч.

Цікава, але жаночыя вясельныя туфлі таннейшыя за мужчынскія. Напэўна, тавар не самы хадавы.

Д'ябал у дробязях

Ведаеце, аб чым часцей за ўсё забываюць маладыя? Аб заручальных пярсцёнках! Гэты неад'емны атрыбут любога шлюбу сёння можа істотна павялічыць святочны каштарыс. У краме двухграмовыя залатыя пярсцёнкі можна знайсці па цане ад **1 мільёна 200 тысяч да некалькіх мільёнаў**. Справа ў тым, што ў нашай краіне павялічыліся кошты на золата. Танней замовіць гэтыя ювелірныя вырабы ў майстроў. Калі вы прыходзіце да майстра са сваім металам, то пяціграмовыя колцы абыдуцца прыкладна ў 200—300 тысяч.

Сёння модна заказваць спецыяльныя келіхі для маладых у адным стылі з падушачкай для пярсцёнкаў. Так-так, ёсць і такі пункт у вясельным каштарысе. Такі набор каштуе 40—90 тысяч.

Упрыгажэнні на аўто будуць каштаваць ад 30 да 120 тысяч за штуку. Заказаць спецыяльны вясельны аўтобус, які давязе вашых гасцей да месца падзей, каштуе 1 тысячу долараў. А вось звычайныя "мазаўскія" аўтобусы абыдуцца ў 37 тысяч за гадзіну.

Неад'емнай часткай сучаснага вяселля сталі запрашэнні. Узоры і тэхналогіі можна знайсці на тэматычных сайтах у інтэрнэце. Калі рабіць іх сваімі рукамі няма ні сіл, ні жадання, можна заказаць іх у дызайнера (каля 170 тысяч за 10 штук) ці надрукаваць (каля 200 тысяч за 20 штук).

Не забывайцеся і на аздабленне залы. Паветраныя шары — ад 50 долараў на ўсю залу, чахлы на крэслы — каля 750 тысяч за 50 штук, кветкі — ад 20 долараў да бясконцасці. Апошнім часам мінскія гандляры прапануюць цікавы тавар з экзатычнай назвай "бумфеці". Не, гэта не ядуць. Пнеўматычныя хлапушкі асыплюць маладых штучнымі купюрамі ў 500 еўра ці 100 долараў, а каштуюць ад 25 да 30 тысяч за штуку.

Паслугі тамады абыдуцца маладым у суму ад 100 умоўных адзінак да некалькіх тысяч. Усё залежыць ад таго, наколькі знакаміты ваш вядучы. Прыкладна такія ж кошты і ў музыкаў.

Калі вырашыце ставіць шлюбны танец, падрыхтуйце па 50 тысяч за кожны занятак. Для добрага выніку іх павінна быць не менш як пяць.

Каб ніводная драбяза вашага вяселля не забылася з цягам часу, трэба запрашаць фатографаў і відэааператараў. Успаміны дорага каштуюць. За фота вы аддасцё мінімум 90 долараў, за відэа — мінімум 150 долараў.

Вынікі

Такім чынам, вяселле ў крызісную пару абыдзецца прыкладна ў 13 мільёнаў рублёў. Склаўшы падрабязны каштарыс, жаніх і нявеста могуць лёгка палічыць, што ў іх свяце залішняе.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ДАРЭЧЫ

Колькі прынята дарыць на вяселле?

Згодна з традыцыямі, на вяселле трэба дарыць падарункі. Часцей за ўсё госці нясуць маладым грошы. Прыстойная сума для сяброў — ад 50 да 100 умоўных адзінак, для сваякоў — ад 100 долараў. А вось бацькі звычайна дораць дзецям нешта карыснае — батывую тэхніку, машыны і нават кватэры.

На заробкі за мяжу?

Зарплаты беларусаў абясцэньваюцца з шалёнай хуткасцю. Праславутыя 500 долараў сёння — гэта два з паловай мільёны рублёў па афіцыйным курсе. А па чорным — рэальным — і ўсе тры з паловай! Цяжка ўявіць, хто сёння ў Беларусі столькі зарабляе.

Дарэчы, яшчэ ўвесну, калі беларускі рубель толькі пачаў падаць, расійская Служба Гэлапа, якая вывучала міграцыйны настрой у постсавецкіх краінах, агучыла вынікі свайго сацыялагічнага даследавання. Атрымалася, што Беларусь па колькасці жадаючых атрымаць працу за межамі радзімы апынулася на трэцім месцы пасля Арменіі і Малдовы.

Сёння, па ацэнках беларускіх экспертаў, сітуацыя яшчэ больш крытычная: калі ў жніўні ў беларускай эканоміцы не адбудзецца пазітыўных змен, восенню эміграцыя беларускіх спецыялістаў павялічыцца. Шукаць працу за мяжой, у прыватнасці у суседняй Расіі, могуць будаўнікі, паліграфісты, прадаўцы і прадстаўнікі іншых спецыяльнасцяў.

Дарэчы, журналісты інтэрнэт-рэсурсу "Заўтра тваёй краіны" параўналі зарплаты па спецыяльнасцях, на якія часцей за ўсё ўладкоўваюцца беларусы ў Расіі.

Прафесія	Зарплата (у сярэднім у доларах) у Расіі (Масква і рэгіён)	Зарплата (у сярэднім у доларах) у Беларусі
Прадавец у магазіне	500—700	180—250
Будаўнік	1000	380
Рабочы ў прамысловасці	650—1000	340
Праграміст	1500—4000	550
Сістэмны адміністратар	1100	400
Школьны настаўнік	450	200
Менеджар па продажы	ад 900	ад 300
Афіцыянт	900	300
Вартаўнік	ад 700	200
Повар, кандытар	ад 850	300
Хатняя работніца, пакаёўка, няня	ад 600	250

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ЗАКУЛІССЕ

Сідорскі ўпершыню пасля адстаўкі з'явіўся на публіцы

Былога прэм'ер-міністра заўважылі на стадыёне "Дынама" 10 жніўня.

Журналістам спартыўнага сайта goals.by Сідорскі паведаміў, што ходзіць на ўсе хатнія матчы беларускай зборнай і балее за нашых футбалістаў. А вось пра свае планы былы чыноўнік гаварыць адмовіўся. Калі журналісты задалі пытанне наконт цяперашняй працы Сідорскага, ён пажартаваў, што цяпер дапамагае выйграваць нацыянальнай зборнай. Нагадаем, Сідорскага знялі з пасады прэм'ер-міністра ў канцы 2010 года, перад прэзідэнцкімі выбарамі. З таго часу афіцыйна не паведамлялася аб ягоным месцы працы.

Што агульнага ў Андрэя Хадановіча з Жэрарам Дэпардзье?

Беларускі паэт і перакладчык прыме ўдзел у запісе аўдыёкнігі, якая змесціць некалькі твораў паэта Чэслава Мілаша.

Старшыня беларускага ПЭН-цэнтра далучыўся да міжнародных праектаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння польскага паэта Нобелеўскага лаўрэата **Чэслава Мілаша**. У Брэсце Хадановіч прымаў удзел у запісе аўдыёкнігі вершаў паэта.

"Аўдыёкніга — разынка міжнароднай праграмы святкавання юбілею пісьменніка, — прызнаўся "Брэсцкаму кур'еру" Хадановіч. — *Гэта аднолькавыя па афармленні дыскі працягласцю прыкладна 60 хвілін, на якіх Чэслава Мілаша чытаюць акцёры і паэты 10 розных краін: у Лондане, Парыжы, Мадрыдзе, Маскве, Кіеве, Токіа і сярод іншых у Мінску. Наколькі я ведаю, чытаюць такія людзі, ажно дух захоплівае. У Парыжы за гэта браўся Жэрар Дэпардзье, у Мадрыдзе — вядомы рэжысёр Пэдра Альмадовар, у Расіі — Сяргей Юрскі, дай яму Бог здароўя. У Мінску да гэтай слыннай кампаніі прымазаўся не акцёр, а перакладчык".*

НУ И НУ!

По главной улице... в чем мать родила

Прогулку четверых голых горожан по одной из главных улиц Барановичей сотрудники правоохранительных органов расценили как хулиганство. Им может грозить до шести лет тюрьмы.

Четверо мужчин, проживающих в Северном микрорайоне, находясь в состоянии алкогольного опьянения, средь бела дня прошлись от Светиловского озера до Ледового дворца... в чем мать родила.

"Прохожие, ставшие свидетелями этого "парада нудистов", позвонили в милицию, и нарушители порядка были задержаны сотрудниками департамента охраны", — сообщила местной газете Intex-Press пресс-секретарь Барановичского ГОВД Наталья Седельник.

По ее словам, все задержанные ранее были судимы, некоторые — неоднократно. Возраст "нудистов" — от 23 до 38 лет.

В отношении горожан возбуждено уголовное дело, им может грозить до 6 лет лишения свободы.

ЛИЧНЫЙ ОПЫТ

Привет вам с кисточками!

При всем богатстве фауны Беларуси нельзя сказать, что она изобилует хищными ее представителями: у нас водятся лишь рысь, волк да росомаха. Не думаю, что человек, мирно собравшись в лес за грибами-ягодами, мечтает о встрече с ними. Но вот перед вами несколько просто невероятных, фантастических (однако абсолютно правдивых!) историй.

Рысь — увидеть ее в природе, а не в зоопарке, я мечтала уже давно, поскольку всех представителей семейства кошачьих, как домашних Мурок, так и диких хищниц, не просто люблю. Считаю, что прекрасней кошки зверя нет. Ну что нам, белорусам, эти небелорусские тигры, леопарды и гадкие львы? А вот рысь — она наша, она — гордость наших лесов...

Конечно, понимала: мои шансы встретиться с рысью в природе равны нулю. Поскольку зверь этот скрытный, ведет сумеречно-ночной образ жизни. Но вот однажды...

В ягодно-грибной сезон раз в неделю мы с мужем непременно наведываемся в близлежащие от города леса. Мой излюбленный — Пожежинский лесной массив. Он — в часе езды на поезде от Бреста. Выходя на станции, сразу вступаешь в сказку — поистине Берендеев лес. И вот как-то мы с мужем, удалившись от станции примерно на километр, с изумлением увидели прибитую к дереву автомобильную шину с надписью: "Осторожно, кошки!". Интересно, какие же здесь могут быть кошки? Одичавшие?.. Но ближайший населенный пункт от леса достаточно далек. Тогда — что означает надпись? Загадка...

До этой нашей поездки достаточно долго держалась жаркая, без дождей, погода. Мы, как обычно, брели по лесной дороге на довольно большом отдалении друг от друга, высматривая грибы. На одном из участков дорога пошла вниз, впереди — основательная лужа. И вот, приближаясь к ней, поднимаю глаза, отвлекаясь от поиска грибов — и... чувствую, что ноги подкашиваются. Потому что из этой самой лужи, совсем близко от меня, преспокойно лакает воду... рысь. Не веря своим глазам, я преглупо от растерянности залепетала: "Кис-кис, кошечка, хочешь, я тебе колбаски дам?"

Рысь повернула голову в мою сторону — и даже со своего места я рассмотрела ее взгляд. Ни капли страха! Только превосходство или презрение к ничтожному человечку! Рысь еще некоторое время попила, опять взглянула в мою сторону, дернула своим куцым хвостом, брезгливо отряхнула мощные лапы — и величаво, совершенно не спеша, удалилась в придорожные заросли с непередаваемо-кошачьей грацией.

Первое, что после изрядного обалдения мне подумалось: может, голову напекло, просто померещилась эта изумительная киска с кисточками и бакенбардами? Придя, наконец, в себя, я докричалась до мужа, позвала его, так сказать, на экспертизу. Дело в том, что долгие годы он работал начальником геодезической партии на Дальнем Востоке и в Сибири, был опытным охотником и, само собой, может по следу зверя определить его видовую принадлежность. Муж уверенно подтвердил, рассмотрев следы возле лужи: да, это действительно была рысь!

Долго после этой встречи я жила счастливой — надо же, как повезло, такое случается раз в жизни... Да, только ошибалась насчет одного раза. Поскольку в этом году, не далее чем около месяца назад, в том же Пожежинском лесу я опять удостоилась такого "счастья".

Отправились мы туда не столько надеясь на первые боровички, сколько просто для того, чтобы отдохнуть от городской тоски.

Как обычно мы, все-таки надеясь хотя бы на минимальный "грибной улов", разделились и ушли далеко друг от друга. С утра все было хорошо, а вот ближе к полудню стало жарко и, соответственно, некомфортно. По крайней мере, у меня впервые за долгие годы регулярных поездок резко прихватило сердце.

По ходу моего движения был небольшой овражек, за которым начинался совершенно непроходимый бурелом. И углядела я в овражке, как показалось, боровичка. Рванувшись к нему, я поскользнулась на бархатистом мху и по склону овражка скатилась вниз. А оказалось — не боровичок это был, а кусочек коры. То ли от расстройства из-за своей ошибки, то ли от падения, мне вдруг стало совсем плохо с сердцем (проклятая стенокардия!). Выпутываясь из лямок рюкзака, кое-как извлекла из его недр сердечные капли (в состав которых, помимо прочего, входит и настойка валерианы), накапала нужное их количество на кусочек сахара-рафинада. И тут — пузырек с лекарством, который я не успела закрыть, вдруг выскользнул из моей вспотевшей руки, и капли, естественно, пролились.

Помня рекомендации врачей, что после приема лекарства надо некоторое время полежать, я умостилась на рюкзаке, даже вздремнула.

...Сколько так отдыхала — не знаю, а только проснулась с отчетливым чувством, что рядом кто-то есть. А кто — изумилась, открыв глаза. Сцена была еще та — хоть в кино снимай! Буквально рядышком, в нескольких метрах сверху от овражка, куда я выронила пузырек от лекарства, была рысь.

...Не знаю, сколько мы "любовались" друг другом — словно выпала я из времени. Честно сказать — шевельнуться и дышать боялась. Шутка ли — рядышком рысь! Домечталась, называется...

А она, еще некоторое время полежав, поднялась, потянулась, зевнула. И ушла.

Рассказав об этих двух эпизодах специалистам-экологам, услышала: мне и в самом деле повезло. В частности, старший научный сотрудник Национального парка "Беловежская пуща" С.Н.Гуневич сказал, что за 30 лет своей работы в пуще он только один раз видел рысь в природе. И, кстати, случаев нападения рыси на человека в Брестской области не зарегистрировано. Еще специалисты удивились, что мои встречи с рысью были в Пожежине. Поскольку, согласно наблюдениям работников лесного хозяйства, в области рысь преобладает в Ганцевичском, Ляховичском, Лунинецком, Пинском, Ивацевичском районах — в общем, там, где есть дремучие, захламленные леса.

Для справки:

Рысь — животное, занесенное в Красную книгу. На территории Брестской области за последние годы численность рыси возрастает. В 2008 году численность рысей была 54 особи, в 2009 г. — 59, в 2010 — 78. На территории Брестского лесничества сейчас зарегистрировано 8 рысей.

Ольга СВАНССЕН.
Брест.

ЧУЖЫ КАШАЛЁК

«Калі раней набывалася паўкіло каўбасы, то зараз — 200—300 грамаў»

Спартсмены — не жыхары асобнай планеты. Яны жывуць сярод нас, і праблемы звычайных людзей ім таксама добра знаёмы. Як яны жывуць у эканамічны крызіс? На чым эканомяць?

На мінулым тыдні ў Беларусі ў які ўжо раз за гэты год былі павышаны адпускныя кошты на мяса, хлеб і малочную прадукцыю. Падвышэнне, здаецца, не такое вялікае (на 5%), аднак, улічваючы мінулыя падаражанні, кошты на прадукты — ого-го! Некаторыя цэннікі проста пужаюць. У чым вы вымушаны сабе адмаўляць, ці праблема павышэння коштаў вас не закранула?

Таццяна ТРОІНА, баскетбалістка зборнай Беларусі:

«Не пераставаць жа на машыне ездзіць...»

— Шчыра кажучы, рост цэн у крамах я заўважаю, хаця раней асаблівай увагі гэтаму не надавала. Аднак зараз бачна: кошты на прадукты павысіліся вельмі істотна. Канечне, менш набываць я не стала, бо чалавек павінен жа нечым харчавацца. Але вось цяпер задумваешся: а колькі грошай уходзіць на пакупкі? Што ж зробіш, усё роўна прыходзіцца набываць. Тое самае можна сказаць і адносна бензіну: кошт расце, але не пераставаць жа з-за гэтага на машыне ездзіць.

У камандзе мы падвышэнне коштаў не абмяркоўваем, але з блізкімі людзьмі я на гэтую тэму размаўляю. Проста для маіх сваякоў, у якіх заробак 500—600 тысяч рублёў, гэта вельмі моцны ўдар. Хочацца верыць, што з часам сітуацыя ў краіне зменіцца да лепшага і ўзровень заробкаў падцягнецца за коштамі.

Аляксандр КАРШАКЕВІЧ, гандбольны трэнер:

«Гэта катастрофа!»

— Рост коштаў у апошні час не заўважаць нельга. Ён, канешне ж, непасрэдна адбіўся на маім кашальку. Заробак застаўся тым жа, а кошты мінімум у два разы выраслі. Лічу, што гэта катастрофа. Хлопцы ў камандзе гэтую тэму таксама абмяркоўваюць, бо цяжка зараз усім. Людзі хочуць нешта набыць, а грошай ужо не заўжды хапае. З сябрамі і блізкімі гэтую тэму асабліва не кранаю. А якія могуць быць размовы, калі ты не можаш набыць тое, што мог сабе дазволіць яшчэ месяц таму? Напрыклад, бытавую тэхніку ўвогуле набыць немагчыма. І з прадуктамі харчавання сітуацыя не самая лепшая. Калі раней набывалася паўкіло каўбасы, то зараз — 200—300 грамаў. Карацей кажучы, эканоміць сёння трэба на ўсім.

Не ведаю, ці павялічыцца заробак, але, мне падаецца, сітуацыя павінна стабілізавацца. Увогуле, я гляджу ў будучыню з аптымізмам: заўжды трэба спадзявацца на лепшае.

Іштвар ШАНДАР, футбаліст, паўабаронца наваполацкага "Нафтана":

«Стараюся меней хадзіць па рэстаранах»

— Для сябе ўжо адзначыў, што апошнім часам кошты растуць вельмі хутка. І ў нашай футбольнай раздзявальні гэтая тэма пастаянна абмяркоўваецца. Якраз нядаўна размаўлялі з хлопцамі наконт чарговага павышэння коштаў на мяса і іншыя прадукты. Думаю, усе зараз за гэтым сочаць. На дадзены момант у нашай камандзе амаль усе — песімісты, думаюць, што з часам сітуацыя толькі пагоршыцца. А я нават не ведаю, што думаць... У нас у Венгрыі таксама былі эканамічныя праблемы, але каб за год два-тры разы павышалі кошты на прадукты і каб нацыянальная валюта так рэзка падала, я не помню. Мне падаецца, што калі за бліжэйшыя чатыры-пяць месяцаў ніякіх сур'ёзных мер у эканоміцы прадпрынята не будзе, то можа быць яшчэ горш.

Мае сваякі ў Беларусі — простыя рабочыя, таму ім у гэтай сітуацыі прыходзіцца складана. Але яны стараюцца выжываць, і я, чым магу, дапамагаю. Пры гэтым на прадуктах я не эканомлю: усё ж такі для спартсмена правільнае харчаванне вельмі важна. Але ў той жа час стараюся больш гатаваць дома, а не хадзіць у рэстараны.

Наталля ЦЫЛІНСКАЯ, веласіпедыстка:

«Ад пустога гаварэння нічога не зменіцца»

— Хаця ў мяне пакупкай прадуктаў займаецца муж, а я сама ў краму не хаджу, павышэнне коштаў не магу не заўважаць. Ды і ўвогуле, праблема шмат дзе абмяркоўваецца. Аднак я звычайна ў такія размовы не ўмешваюся. Ад пустога гаварэння нічога не зменіцца. Навошта лішні раз абсмоктваць якое-небудзь пытанне? Ад гэтага можа толькі горш зрабіцца, але ніяк не лягчэй. Я ўвогуле стараюся не разважаць пра тыя сітуацыі, у якіх сама нічога змяніць не магу. Не бачу сэнсу абмяркоўваць, наракаць, калі я не магу што-небудзь з гэтым зрабіць. Такімі размовамі ты толькі псуеш нервы сабе і суразмоўцу.

Юрый ПУНТУС, футбольны трэнер:

«Жонцы рост коштаў не падабаецца»

— Калі скажу, што заўважыў значны рост коштаў, то схлушу, таму што паходамі ў краму ў нашай сям' і займаецца жонка. Аднак чую, што гавораць людзі на вуліцах і што абмяркоўваецца ў маім доме. Сёння такім становішчам заклапочаны многія. Хаця ў камандзе, па-мойму, на

гэтую тэму размовы не вядуцца. А вот мая жонка ўвесь час са мной размаўляе на гэты конт, наракае на рост коштаў. Ёй такая сітуацыя не падабаецца. Аднак мне ў той сітуацыі, якая склалася, можна цярпець. А вось простым людзям — кіроўцам, пенсіянерам — прыходзіцца цяжкавата. У мяне мама жыве разам з маёй сястрой, і яны зараз не могуць шмат чаго сабе дазволіць. Дапамагаю. Хаця, шчыра кажучы, мне на гэты момант цяжка ацаніць усё становішча спраў, я вельмі заняты футбольнымі праблемамі.

Дзмітрый МІЦКЕВІЧ, *goals.by*

ВОКРУГ СПОРТА

«Реал» подписал контракт с 7-летним ребенком

Мадридский футбольный клуб "Реал" заключил контракт с семилетним аргентинским игроком Леонелем Анхелем Коирой. На каких условиях и на какой срок подписано соглашение, не уточняется. Коира приступит к тренировкам с одной из детских команд "Реала" 6 сентября этого года, сообщает Associated Press.

О подписании контракта с Коирой рассказал официальный представитель "Реала" Хуан Тапиадор. При этом на сайте мадридского клуба информации об этом нет. Популярное аргентинское издание Ole написало, что Коира станет самым юным футболистом, с которым "Реал" подпишет контракт. После подписания соглашения Тапиадор эту информацию опроверг, но не сказал, когда клуб заключал контракт с более юным игроком.

В интервью Ole Коира рассказал, что его кумиром является аргентинец Лионель Месси из "Барселоны", а мечтой — пробиться в основной состав "Реала". По данным Ole, подписать контракт с Коирой также хотел мадридский "Атлетико".

Греков выгнали из Лиги Европы

Греческий футбольный клуб "Олимпиакос" из города Волос исключен из розыгрыша Лиги Европы сезона-2011/12. Об этом сообщает официальный сайт УЕФА. "Олимпиакос" отстранен от участия в еврокубках на три года с испытательным сроком в пять сезонов. Люксембургский клуб "Диффердранж" получит право продолжить борьбу в розыгрыше футбольной Лиги Европы благодаря дисквалификации греческого "Олимпиакоса".

"Олимпиакос" и еще один клуб — "Кавала" — оказались в центре расследования дела о договорных матчах в греческом футболе. Обе команды были исключены из греческой Суперлиги, но подали апелляцию, которая была удовлетворена.

Апелляционный комитет Греческой федерации футбола смягчил наказание клубам: "Олимпиакос" лишен десяти очков в чемпионате страны сезона-2011/12, а с "Кавалы" сняты восемь очков, сообщает Reuters. По правилам УЕФА, клубы, которые наказаны лишением очков, не могут участвовать в еврокубках.

Антон ВИТАЛЬЕВ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Уладзімір БЕРАЖКОЎ:

«Нам застаецца толькі цярпець, што мы і робім...»

Галоўны рэдактар спартыўнай газеты "Прессбол" Уладзімір Беражкоў абверг чуткі аб тым, што пад ціскам эканамічнага крызісу папяровая версія газеты зачыняецца.

Аб магчымым закрыцці папулярнай спартыўнай газеты пішуць на інтэрнэт-форумах. Людзі называюць самую відавочную прычыну для закрыцця "Прессбола" — эканамічны крызіс. Аднак галоўны рэдактар выдання Уладзімір Беражкоў гаворыць, што прычын для панікі няма.

— Скажам так, чуткі пра закрыццё "Прессбола" моцна перабольшаны, — адзначыў ён у відэаінтэрв'ю парталу TUT.by — Канечне, мае месца скарачэнне папяровага тыражу газеты. Гэта звязана з тым, што газетная папера падаражала ўжо ў два разы, паслугі па распаўсюджванні і друку газеты — таксама. Адна справа — зрабіць газету, а зусім іншая — даставіць яе, як гарачы піражок, спажыўцу. Гэтыя тарыфы растуць, і, уласна кажучы, мы былі вымушаны падымаць кошт на газету. А калі кошт расце... Пачынаючы з вясны рознічны кошт нумара "Прессбола" вырас на 50%, а тыраж мы былі вымушаны зменшыць на 18—20%. Маю на ўвазе папяровы варыянт. У той жа час мы як альтэрнатыву актыўна развіваем падпіску на pdf-версію выдання. Ва ўсім свеце яна не пайшла, сур'ёзнага вопыту рэалізацыі электроннай версіі газеты не існуе, таму што як толькі чалавек заходзіць у інтэрнэт і бачыць, што за нешта трэба заплаціць, ён адтуль тут жа сыходзіць.

Спрабавалі англійскія, нямецкія, французскія, расійскія газеты прадаваць pdf-версію, нічога ў іх не атрымалася, а ў нас атрымліваецца. Калі толькі браліся за гэта, было мала веры, што нешта атрымаецца. Тым не менш у сакавіку мы пачалі з 200 экзэмпляраў электроннай версіі, а зараз у нас прырост ужо 400%. Умоўна кажучы, тыраж у папяровай газеты быў 25.000 экзэмпляраў, па падпісцы мы рэалізоўвалі 5000. І зараз мы гаворым людзям, што калі колькасць pdf-падпісчыкаў дасягне 5000 чалавек, то гэта дазволіць нам зрабіць самастойную версію газеты, якая не залежыць ад коштаў на паперу. Мы зможам выходзіць тады, калі захочам. Напрыклад, у панядзелак. Панядзелак — гэта самы бойкі дзень на рынку. Людзі згаладаліся за выхадныя па прэсе, і яны гатовы купіць газету. Раскруціць нашых манапалістаў у галіне друку і распаўсюджвання на тое, каб "Прессбол" выходзіў у панядзелак, нам не ўдаецца. Яны такія ў гэтым сэнсе непаваротлівыя...

Уладзімір Беражкоў таксама адзначыў, што рэдакцыя "Прессбола" не збіраецца адмаўляцца і ад папяровай версіі выдання:

— Зараз аўдыторыя папяровай версіі — 20.000 чалавек. Як можна ад яе адмаўляцца? Гэта ж сур'ёзная аўдыторыя. За 20 гадоў існавання газеты ў нас былі такія выпадкі, калі экзэмпляр газеты выпісваўся на вёску ці паўпасёлка. Падпіска адна, а чытаюць чалавек 20—30. Тое самае і ў студэнцкіх аўдыторыях. Нам трэба ўтрымаць людзей, чаго б нам гэта ні каштавала. Нам застаецца толькі цярпець, што мы і робім...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

УСЛУГИ

Выкопаю колодец под воду и канализацию. Качественно. Найду воду на участке.

Тел. 8-029-626-32-54.

ПО ПОВОДУ

Обреченные на вылет,

или Почему проигрывают наши футбольные клубы?..

Конечно, я понимаю, что рассуждения на тему очередного вылета наших футбольных команд из европейского клубного турнира (Лига Европы) не так уж и приятны, но все же...

Знаете, долбит мысль: почему такая ситуация как-то уж очень гладко сходит с рук ответственным футбольным руководителям? С этими регулярными неудачами не хотят мириться лишь болельщики... Нынче наши команды выпроводили из Лиги Европы уже в июле—августе, и уже осенью нам, болельщикам, не за кого, кроме БАТЭ, будет болеть. Вдумайтесь, три наши команды оказались за бортом от соперников, которые, откровенно скажем, звезд с неба не хватают. Так, наш "Шахтер" не смог одолеть "Вентспилс" из Латвии. "Минск" уступил турецкому "Газиантепспору", а "Гомель", хотя и начал с 3-го квалификационного раунда тоже с турецким "Бурсаспором", но дальше не продвинулся. И даже в родных пенатах проиграл 1:3! По этим играм у меня сложилось впечатление, что нашим ведущим клубным командам по-прежнему не хватает скорости при работе с мячом, большей агрессии при отборе мяча и специальной выносливости, а главное — умения использовать каждую голевую ситуацию. Без наличия этих качеств в европейских клубных соревнованиях значимого результата добиться просто невозможно!

И несмотря на это у нас некоторые футбольные специалисты продолжают утверждать, что уровень чемпионата страны с каждым годом растет. Если и растет, то как-то незаметно, а вот как показывают еврокубки — настоящее мерило уровня нашего чемпионата, то мы топчемся на месте. И, безусловно, с этим что-то надо делать, надо что-то предпринять действенное.

Утверждали, что сокращение числа команд в высшей лиге явится важным условием повышения уровня нашего чемпионата, но, как видим, и урезание пока желаемого результата не дает.

Согласитесь, что одним урезанием всех проблем в нашем футбольном хозяйстве не решить. На мой взгляд, в первую очередь нужно в корне пересмотреть отношение к детско-юношескому футболу как к фундаменту футбольной пирамиды.

Ведь не просто так недавно в одном из интервью Георгий Кондратьев сказал, что последние отрицательные результаты наших юношеских команд оптимизма не вселяют. И далее, поймите, о каком развитии может идти речь, если в наши дни юные динамовские футболисты играют на асфальте?

Неужели руководители прославленного общества не понимают, что тренироваться и играть на асфальте означает губить юные дарования и труд тренеров!

И вообще, все футбольные школы должны быть при клубах. Этот вопрос уже не терпит отлагательства. И надеюсь, что новый председатель ассоциации "Белорусская федерация футбола" С.Н.Румас поможет решить эту проблему.

С уважением —

Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран спорта, заслуженный тренер БССР.

Минск.

ШАХМАТЫ

Из творчества белорусских шахматистов

Предлагаем вниманию читателей двухходовую задачу-миниатюру, которую составил и прислал в редакцию известный белорусский проблемист Николай Иванович Бельчиков (Борисов).

Белые: Крс7, Фd3, Лd7, п. е5 (4).

Черные: Кре6, пп. d4, f6 (3).

Мат в 2 хода.

Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная Воля", "Шахматы".**

Победа Виталия Тетерева

В Минске прошел Международный шахматный турнир "Минск-опен-2011".

В нем приняли участие 126 спортсменов, в основном из Беларуси и России, а также Голландии, США и Хорватии. Турнир проводился по швейцарской системе в 9 туров. Среди участников было семь международных гроссмейстеров, международные и национальные мастера. В связи с кризисом уменьшился призовой фонд по сравнению с прошлым годом. Поэтому не удалось привлечь к участию элитных гроссмейстеров. В напряженнейшей борьбе, исход которой определил лишь последний тур, сразу три участника финишировали, набрав по 7,5 очка из 9. Чтобы определить победителя, судьям пришлось считать коэффициенты. В результате первый приз получил гроссмейстер из Новополоцка Виталий Тетерев. Серебряным призером стал российский гроссмейстер Иван Попов, а третье место у неоднократной чемпионки страны международного мастера Натальи

Поповой. Ее результат следует отметить особо. Крайне редко женщинам удается подниматься на пьедестал в мужских международных турнирах. А минчанка опередила большую группу участников, которые намного опережали ее по рейтингу. На полочка от победителей отстал витебчанин, гроссмейстер Андрей Ковалев. Сразу семь участников финишировали, набрав по 6,5 очка. Компьютер расставил их в турнирной таблице в следующем порядке: 5.гроссмейстер Андрей Жигалко (Беларусь), 6.Дмитрий Курукин, 7.Максим Смариев (Россия), 8.гроссмейстер Игорь Люцко, 9.Дмитрий Буланов, 10.Денис Трифонов, 11.Андрей Горовец (все из Беларуси).

Празднику посвящен

В Минске в Центре олимпийской подготовки по шахматам и шашкам прошел темпотурнир, посвященный Международному дню шахмат. В соревнованиях, которые проводились по швейцарской системе в 10 туров, приняли участие 44 спортсмена. Победителем турнира стал международный мастер Павел Ломако, набравший 8 очков. Всю дистанцию он прошел без единого поражения. Вторым на финише был чемпион Минска 2010 года кандидат в мастера Дмитрий Полещук, третьим — гроссмейстер Игорь Люцко.

ЧУЛІ?

Беларусь хоча прыняць фінал Лігі Еўропы

Федэрацыя футбола Беларусі прыняла рашэнне падаць у УЕФА заяўку на правядзенне фінальнага матча Лігі Еўропы 2015-га ці 2016 года.

Здаецца, падставы для гэтага ёсць. Флагман беларускага футбола — барысаўскі БАТЭ — некалькі гадоў запар прабіваецца на еўраарэну. Барысаўчане былі першай і адзінай беларускай камандай, якой удалося згуляць у групавым этапе Лігі чэмпіёнаў УЕФА.

Аднак задавальненню беларускай заяўкі можа перашкодзіць палітычная сітуацыя ў краіне.

Тое самае мы бачым зараз з чэмпіянатам свету па хакеі, права на правядзенне якога атрымала Беларусь. Хакейны чэмпіянат у Мінску павінен прайсці ў 2014 годзе. Аднак ужо зараз некаторыя еўрапейскія палітыкі і правабаронцы выступаюць за тое, каб хакейны чэмпіянат у Беларусі забралі. Матывацыя — наяўнасць палітычных зняволеных у краіне. Адпаведныя заявы накіраваны ў міжнародную федэрацыю хакея. На сённяшні дзень права на правядзенне сусветнага хакейнага першынства ў Беларусі ніхто не забіраў.

Як будзе з футболам? Ці застанецца спорт па-за палітыкай — пакажа час.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 nv@promedia.by http://www.nv-online.by

ISSN 2071-9647

9 772071 964000 11123

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/ 0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 15.08.2011 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26550 экз. Заказ №3926.